05

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Тав. Ліксонава—удзельніца Ўсесаюзнай нарады жонак каманднага і начальніцкага складу РСЧА, узнагароджаная ордэнам „Знак Почета".

Работніца і калгасніца Беларусі

ЫДАННЕ
КП(б)Б

№ 1
Студзень

Дзяржаўная бібліятэка БССР імені Леніна

Новы 1937 год

Радасна і весела сустрэў 170-мільённы народ Краіны соцыялізма новы год.

1936 год быў годам выдатных гістарычных падзей. Кожны з 366 дзён мінулага году быў запоўнен надзвычайнымі справамі, небывалымі подвігамі совецкіх людзей ва ўсіх галінах нашага многагранпага жыцця.

1936 год войдзе ў гісторыю чалавецтва, як год ўсенароднага абмеркавання і зацверджання Сталінскай Канстытуцыі—гэтай вялікай хартыі правоў чалавецтва. У Сталінскай Канстытуцыі запісана ўсё тое, аб чым вякамі марылі лепшыя умы чалавецтва.

Права на працу, права на адпачынак, права на асвету, поўнае роўнапраўе жанчын—усё гэта забяспечана і гарантавана ўсім грамадзянам Совецкага Саюза. Усё гэта заваёвана пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, пад кіраўніцтвам вялікага генія чалавецтва—тварца Канстытуцыі—Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

Ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі мінулы год быў годам яшчэ нябачаных перамог. Датэрмінова выканалі гадавы план цяжкая, харчовая, лёгкая прамысловасць і соцыялістычны транспарт. У нашай краіне стала яшчэ больш машын, яшчэ больш сталі, яшчэ больш абутку, вопраткі, харчовых прадуктаў.

Чыгуначнікі краіны советаў пад кіраўніцтвам жалезнага наркома Лазара Майсеевіча Кагановіча выканалі дадзенае таварышу Сталіну абяцанне: яны грузілі больш 86 тысяч вагонаў у суткі.

Прамысловасць Совецкай Беларусі ў мінулым годзе таксама мела велізарныя поспехі. Аб гэтым сведчаць хаця-б такія лічбы: выпрацоўка ўсёй прадукцыі прамысловасці ў БССР у 1932 годзе складала суму ў 1 мільярд рублёў (у нязменных цэнах 1926—27 гадоў), а валавая прадукцыя 1936 года складае больш 2 мільярдаў рублёў. Адзін толькі прырост выпрацаванай прадукцыі ў 1936 годзе ў 5 разоў перавышае выпрацоўку ўсёй прамысловасці даваеннай Беларусі.

Велізарныя поспехі мелі ў мінулым годзе калгасы. Не гледзячы на неспрыяючыя кліматычныя ўмовы, на засушлівую пагоду, краіна атрымала больш сельскагаспадарчых прадуктаў, чым у ранейшыя гады. Нашы калгаснікі далёка пайшлі наперад па шляху да заможнага і культурнага жыцця.

1936 год быў па праву названы стаханаўскім годам. Слаўныя стаханаўцы прамысловасці, транспарта і сельскай гаспадаркі ставілі новыя рэкорды, намнога павышаючы вытворчасць працы, асвойваючы новую тэхніку. Стаханаўскі рух вылучыў тысячы герояў і гераінь працы літаральна ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі. Многія з гэтых герояў атрымалі ў мінулым годзе вышэйшую ўзнагароду.

Звыш 7 тысяч ордэноў выдаў у 1936 годзе наш урад. Вельмі рознастайны спісак гэтых людзей. Тут і шахцёры, і слаўныя лётчыкі, і ткачыхі, і пагранічнікі, і чыгуначнікі, і ільнаводы, і героі жывёлагадоўлі, і слаўныя ...
камандзіраў Чырвонай арміі.

У ліку слаўных ордэнаносцаў нямалае ... займаюць работніцы і калгасніцы ордэнаноснай Беларусі.

Мы ганарымся нашымі ордэнаносцамі: ... начніцай тав. Вілетнікавай, цялятніцай тав. станцінавай, даяркамі Каўдзерка і Грыгар... лепшымі работніцамі фабрыкі „Кастрычы... т. Кісель, сёстрамі Еўсюцінымі, Валошынай, атр... маўшымі ордэны за выдатны вапнізаваны пер... ход Менск—Масква, і калгасніцай тав. Яноўскай атрымаўшай ордэн за актыўную дапамогу пагранічнікам у ахове нашых граніц. Мы ганарымся ўсёй нашай слаўнай арміяй жанчын-ордэнаносцаў.

Для жанчын і дзяцей Совецкага Саюза 1936 год знамянальны яшчэ адной вялікай падзеяй: гэта прыняцце пастановы аб забароне абортаў, павелічэнні матэрыяльнай дапамогі рожаніцам і ўстанаўленні дзяржаўнай дапамогі шматсямейным. У гэтай пастанове праяўлены выключныя клопаты аб жанчынах і дзецях, якія толькі магчымы ў соцыялістычнай дзяржаве. Тысячы шматсямейных ўжо атрымалі дзяржаўную дапамогу.

„Шэсць маіх сыноў будуць стойкімі абаронцамі соцыялістычнай радзімы“,—усхвалявана заявіла тав. Душчынская старшыні СНК БССР тав. Галадзеду, атрымліваючы дзяржаўную дапамогу.

На радасць мацярам, на радасць усім грамадзянам Совецкага Саюза растуць нашы дзеці. Яны ва ўсім адчуваюць штодзённыя, штогадзінныя клопаты з боку комуністычнай партыі і яе мудрага правадыра вялікага Сталіна. Ім забяспечана шчаслівае, яшчэ нябачанае ў свеце, дзяцінства. Таму так любоўна гучаць іх песні аб вялікім Сталіне. Усюды, у школах і ў палацах піонераў, дома і на новагодніх ёлках, яны разам са сваімі мацярамі славяць імя лепшага свайго друга і настаўніка—імя таварыша Сталіна.

Совецкая жанчына вялікімі справамі адказвае свайму ўраду, сваёй партыі і любімаму таварышу Сталіну за праяўленыя аб ёй клопаты. На фабрыках і заводах, на калгасных палях і фермах, ва універсітэтах і школах, у інтэрнатах і сталовых жанчына—вялікая сіла ў барацьбе за пабудову комуністычнага грамадства.

Лепшыя з лепшых жанчын Совецкага Саюза мелі гонар у 1936 годзе ўдзельнічаць на прыёмах кіраўнікоў партыі і ўрада ў вялікім Крэмлёўскім палацы. Гэта былі стаханаўкі прамысловасці і калгасных палёў, жонкі камандзіраў цяжкай прамысловасці і дэлегаткі Надзвычайнага VIII з'езда Советаў. Канец 1936 года супадае з Усесаюзнай нарадай жонак камандзіраў нашай слаўнай непераможнай Чырвонай арміі.

У вялікім Крэмлёўскім палацы дэлегаткі бачылі лепшага друга чалавецтва—мудрага Сталіна, і кожны раз, калі ён паяўляўся ў прэзідыуме нарады, зал грымеў доўгімі авацыямі і захапляючымі крыкамі „ўра“.

Зок-1/1844

атрыёткі сваёй радзімы—па першаму
лі і ўраду станем на абарону сваёй
ы разам са сваімі мужамі,—заяўлялі
есаюзнай нарады. Гэтымі словамі
ажаны думкі і імкненні кожнай совец-
чыны.

рача адгукнуліся нашы дзяўчаты на за-
енжынцаў даць краіне ў бліжэйшы час
лётчыкаў без адрыву ад вытворчасці.
стаць лётчыкамі, каб навучыцца біць
на яго тэрыторыі",—пішуць нашы раб-

рамадны нашы поспехі і аграмадны нашы
ачы ў наступіўшым 1937 годзе. Барацьба за
равыкананне плана, барацьба за якасць вы-
пускаемай прадукцыі павінны стаць у цэнтры
ўвагі нашых работніц. Барацьба за ажыццяў-
ленне пастаўленай таварышам Сталіным зада-

чы — дабіцца ў бліжэйшыя 3—4 гады 7—8 мільярдаў пудоў зярна—павінна стаць у цэнтры ўвагі нашых калгасніц.

Няма сумненняў у тым, што ў наступіўшым 1937 годзе совецкая жанчына, кожная на сваім участку, натхнёная вялікай Сталінскай Канстытуцыяй, будзе працаваць яшчэ лепш. Няма сумненняў, што апошні год другой пяцігодкі выкліча яшчэ большы ўздым вытворчага энтузіязму ў шырокіх жаночых масах. Няма сумненняў, што працоўныя жанчыны Совецкай Беларусі, як і жанчыны ўсяго Совецкага Саюза, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і мудрага правадыра таварыша Сталіна з яшчэ большай энергіяй возьмуцца за работу, каб дастойна сустрэць дваццатую гадавіну Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі.

Вывучэнне Сталінскай Канстытуцыі работніцамі віцебскай трыкатажнай фабрыкі „КІМ".

НЯХАЙ ЖЫВЕ НАША СЛАЎНАЯ РАДЗІМА!
НЯХАЙ ЖЫВЕ НАШ ДРУГ, НАСТАЎНІК І ПРАВАДЫР ВЯЛІКІ СТАЛІНІ

Усім жонкам, мацерам, сёстрам камандната і началь складу Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, усім жа Совецкага Саюза

(Прынята аднагалосна Ўсесаюзнай нарадай жонак камандн. і начальніцкага складу Рабоча-Сялянскай Чырвонай А на заключным пасяджэнні 23 снежня 1936 года)

Дарагія таварышы!

У выдатныя дні сабраліся мы на Ўсесаюзнаю нараду жонак камандната і начальніцкага складу Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

Мы сабраліся ў дні, калі Сталінская Канстытуцыя стала асноўным законам жыцця ў нашай краіне. Мы сабраліся ў дні ўсенароднага лікавання і таржаства.

Па ўсёй нашай неабсяжнай краіне, на мовах усіх народаў Совецкага Саюза гучаць гарачыя словы беззаветнай любві, бязмежнай адданасці і ўдзячнасці геніяльнаму тварцу Канстытуцыі, нашаму вялікаму правадыру, нашаму бацьку, настаўніку і другу, нашаму роднаму, любімаму Сталіну.

Вялікае, бязмежнае пачуццё радасці і гордасці сыноў і дачок вялікага Савецкага Саюза! Няма такога кутка ў нашай краіне, дзе не раздаваліся-б у гэтыя дні радасныя песні, якія праслаўляюць Сталінскую Канстытуцыю і яе тварца—нашага Сталіна, пад мудрым кіраўніцтвам якога мы заваявалі для сябе і для будучых пакаленняў шчаслівае і радаснае жыццё.

Мы сабраліся з усіх канцоў нашай неабсяжнай і цудоўнай радзімы для таго, каб падвесці вынікі шматгадовай грамадскай рабоце жонак камандната і начальніцкага складу Чырвонай Арміі.

Нам выпала велізарнае шчасце засядаць у сталіцы нашай радзімы, у Маскве, у сэрцы пролетарскай рэволюцыі — у Крэмлі, у вялікім Крэмлёўскім палацы, дзе толькі нядаўна была прынята Сталінская Канстытуцыя.

На нашай нарадзе прысутнічаў вялікі мудры Сталін і яго бліжэйшыя і верныя саратнікі, кіраўнікі нашай комуністычнай партыі і совецкага ўрада. На нашу долю выпала вялікае шчасце расказаць роднаму, любімаму Сталіну і яго верным саратнікам аб нашым чароўным жыцці, аб нашай радаснай, творчай рабоце.

Дарагія падругі!

Наша нарада ярка адлюстравала найвялікшыя перамогі нашай краіны, запісаныя ў Сталінскай Канстытуцыі. Бо толькі ў нас, у краіне соцыялізма, жанчына карыстаецца сапраўднай роўнасцю з мужчынам. Толькі ў нас і для жанчын і для мужчын ажыццёўлены правы на працу, на асвету, на адпачынак, на забяспечаную старасць, права на актыўную, творчую работу, на культурнае і радаснае жыццё. Жанчыны Совецкага Союза жывуць сапраўды шчаслівым і поўнакаштоўным жыццём. Такога жыцця ніколі не было і няма ў працоўных жанчын капіталістычных краін. Фашызм паварварску здзекуецца над чалавечай годнасцю жанчыны, ператварае яе ў хатнюю рабыню.

Толькі ў нашай шчаслівай краіне, у краіне Сталінскай Канстытуцыі, навекі пахавана былое бяспраўе жанчыны. Сталінская Канстытуцыя—асноўны закон Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік—запісала і замацавала правы і абавязкі совецкіх жанчын, як роўнапраўных грамадзян Совецкага Саюза.

Дарагія таварышы!

З самай высокай у свеце трыбуны—трыбуны вялікага Крэмлёўскага палаца мы заклікаем усіх жонак, мацярэй і сясцёр камандната і начальніцкага складу Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі яшчэ шчыльней згуртаваць свае рады вакол вялікай партыі Леніна—Сталіна і нашага совецкага рабоча-сялянскага ўрада.

Мы заклікаем вас яшчэ больш пільна ахоўваць нашы вялікія заваёвы, яшчэ больш актыўна змагацца за таржаство комунізма, яшчэ шчыльней згуртавацца вакол нашага правадыра і д таварыша Сталіна.

Разам з усёй нашай соцыялістычнай краінай няўстанна расце мацнее і ўдасканальваецца наша слаўная Чырвоная Армія. Наша несакрушальная Чырвоная Армія з'яўляецца першакласнай школай комуністычнага выхавання. У ёй вырошчваюцца не толькі высокакваліфікаваныя байцы і камандзіры. У гэтай школе выхоўваецца і расце таксама і баявая падруга камандзіра—яго жонка.

Многія з нас іменна ў Чырвонай Арміі атрымалі асвету, пазналі радасць творчай працы, сталі грамадскімі работнікамі, актыўнымі ўдзельнікамі будаўніцтва соцыялізма.

Сярод нас ёсць удзельніцы гераічных баёў за радзіму ў гады барацьбы з белагвардзейскімі бандамі і імперыялістычнымі інтэрвентамі. Сярод нас ёсць жанчыны, прайшоўшыя са сваімі мужамі суровы шлях грамадзянскай вайны. Для многіх з нас стаж актыўнага ўдзелу ў жаночым руху ў Чырвонай Арміі ровен камандному стажу нашых мужоў.

Правадыр Чырвонай Арміі, бліжэйшы саратнік вялікага Сталіна—маршал Совецкага Саюза Клімент Ефрэмавіч Варашылаў удзяляе велізарную ўвагу нашаму руху, нашаму культурнаму і палітычнаму росту. Ён праяўляе выключныя клопаты аб сям'і камандзіра і палітработніка.

Камандзіры часцей, партыйныя арганізацыі і палітычныя органы штодзень дапамагаюць нам вучыцца, расці, прымаць актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці.

Мы падвялі на нашай нарадзе вынікі нашай многагадовай грамадскай работы. За апошнія гады нязмерна выраслі палітычная актыўнасць і культурны ўзровень нашых жанчын. Сотні тысяч жанчын скончылі палітыч-

-наадукацыйныя і спе-
школы і курсы пры
вонай Арміі. У адным
36 годзе вучобай у
на курсах ахвачана
тыс. жонак камандзі-
палітычных гуртках ву-
57 тыс. жанчын. 25 тыс.
камандзіраў займаюцца ў
чых у арміі агульнаадука-
ых школах. 20 тыс. жанчын
атрымалі ў гэтых школах
днюю асвету. 30 тыс. жан-
атрымалі спецыяльнасць.
а гэта не яркае выражэнне
х выдатных правоў—права на
рацу, права на асвету, права
а творчае культурнае жыццё,
якія ажыццёўлены ў нашай цу-
доўнай краіне, якія замацаваны
Сталінскай Канстытуцыяй!

Мы не толькі вучымся. Мы актыўна дапамагаем сваім мужам у іх складанай адказнай рабоце. Мы жывем тымі-ж інтарэсамі і клопатамі, што і нашы мужы. Для кожнай з нас поспехі баявой і палітычнай падрыхтоўкі часці, у якой служыць муж, сталі яе асабістай, кроўнай справай—справай яе гонару.

Кожная з нас дапамагае паляпшаць культурна-бытавыя ўмовы жыцця і работы байцоў і камандзіраў, стараецца зрабіць казармы і камандзірскія кватэры яшчэ больш утульнымі, усімі сіламі дапамагае палітычнаму і культурнаму росту байцоў.

Тысячы жанчын працуюць у часцях настаўнікамі, лектарамі, бібліятэкарамі, кніганошамі. Дзесяткі тысяч прымаюць удзел у чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці. З велізарнай любоўю прымаюць нашы жанчыны ўдзел у культурным абсталяванні ленінскіх куткоў і клубаў, сталовых і магазінаў, казарм і камандзірскіх кватэр, у азеляненні ваенных гарадкоў і лагераў.

Культурны адпачынак байца і камандзіра стаў прадметам пастаянных клопатаў нашых жанчын. Многія і многія чырвонаармейскія казармы і сталовыя прыбраны парт'ерамі, фіранкамі, абрусамі, вышытымі клапатлівымі жаночымі рукамі. Ваенныя гарадкі і лагерныя пляцоўкі ўпрыгожаны клумбамі, якія разбіты рукамі жонак камандзіраў.

Па ініцыятыве жанчын-актывістак і іх рукамі створаны пры часцях тысячы яслей і дзіцячых садоў. Многія з нас працуюць у гэтых установах. Не толькі ў гарадах, але і ў пагранічных раёнах, у тайзе, у самых аддаленых кутках краіны, воддаль ад чыгунак з найвялікшай настойлівасцю ствараліся намі гэтыя ачагі дзіцячых радасцей, культуры, совецкага выхавання.

Мужы многіх з нас працуюць у аддаленых гарнізонах, ва ўмовах, дзе прыходзіцца перамагаць вялікія цяжкасці. Тут ім асабліва патрабуецца наша дапамога, дапамога іх верных баявых падруг. Прыклад такой актыўнай дапамогі, узоры высокай свядомасці паказалі нашы слаўныя далёкаўсходніцы—жонкі камандзіраў Асобай Чырвонасцяжнай Далёкаўсходняй арміі і Ціхаакіянскага флота. У новых таежных пасёлках, на берагах Амура, у бухтах Прымор'я яны дапамагалі мужам перамагаць усе цяжкасці і мацаваць боездольнасць часцей. Жанчыны прымалі актыўны ўдзел у стварэнні утульных жыллёвых памяшканняў. Яны разводзілі ва ўмовах суровай тайгі агароды. Яны ўпрыгожвалі казармы і ленінскія куткі. У глухіх і яшчэ нядаўна дзікіх мясцах выраслі упарадкаваныя гарадкі з дзіцячымі садамі, школамі, паркамі культуры і адпачынку, стадыёнамі. У іх будаўніцтва ўкладзена не мала сіл і энергіі нашых жанчын.

Жонкі камандзіраў і палітработнікаў прымаюць актыўны ўдзел у фізкультурным руху. Сярод нас ёсць дзесяткі тысяч жанчын, якія здалі нормы санітарнай і проціпаветранай абароны. Сярод нас ёсць варашылаўскія стралкі, парашутысткі, удзельніцы ваенізаваных пераходаў на 1000 кілометраў, варашылаўскія кавалерысты. 50 тысяч жонак камандзіраў і палітработнікаў маюць абарончыя і фізкультурныя значкі.

Мы ведаем, што роўнапраўе жанчын у СССР заключаецца і ў тым, што жанчыны ў нас маюць права, магчымасць і абавязак разам з мужчынамі абараняць гонар і незалежнасць нашай вялікай, нашай любімай радзімы.

Мы і ў далейшым будзем вучыцца страляць яшчэ лепш, будзем рыхтавацца да санітарнай службы, да проціпаветранай і проціхімічнай абароны. Будзем рыхтавацца да нашага ганаровага абавязку—гераічна абараняць свяшчэнныя граніцы нашай роднай вялікай краіны.

Прымаючы ўдзел у грамадскай рабоце, мы пастаянна памятаем аб сваіх сем'ях, аб нашых дзецях, аб нашых мужах. Мы цвёрда і глыбока ўсведамляем нашу найвялікшую адказнасць за выхаванне дзяцей, за выхаванне дастойнага сталінскага пакалення моцных фізічна і духоўна загартаваных совецкіх патрыётаў. Жанчына-маці ў Чырвонай Арміі, як і ва ўсёй нашай сталінскай краіне, карыстаецца вялікай павагай, акружаная любоўю, увагай і клопатамі.

Мы жывем аднымі інтарэсамі з нашымі мужамі. Нашаму сэрцу блізка і дорага тая справа, якой нашы мужы аддаюць усе свае сілы—іменна гэта ўмацоўвае нашу сям'ю, робіць сем'і камандзіраў моцнымі, дружнымі, патаварыску спаянымі совецкімі сем'ямі.

Жанчына Чырвонай Арміі павінна заўсёды памятаць, што наша грамадская дзейнасць у часцях, нашы клопаты аб выхаванні дзяцей і клопаты аб мужу, аб яго здароўі і адпачынку,—усё гэта таксама абарончая работа, усё гэта служыць справе ўмацавання Чырвонай Арміі.

Дарагія падругі! На небывалую вышыню ўзнімае Сталінская Канстытуцыя званне грамадзяніна СССР. Новы, соцыялістычны чалавек павінен быць палітычна высока граматным, усебакова развітым, культурным. Лік такіх людзей у нашай краіне безупынна расце. Мы не можам адставаць ад гэтага росту. Мы павінны ісці ў нагу са сваімі мужамі, якія нястомна ўдасканальваюцца, растуць палітычна і культурна. Баявая падруга камандзіра і палітработніка Чырвонай арміі павінна быць культурнай, палітычна граматнай, моцнай целам і духам, перадавой совецкай жанчынай.

Вучыцца! Вучыцца яшчэ лепш, яшчэ арганізаваней, чым да гэтага часу—вось найпершая наша задача.

Авалодвайце, дарагія падругі, палітычнай граматай, вывучайце вялікае вучэнне Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна! Вывучайце Сталінскую Канстытуцыю—найвялікшы дакумент нашай эпохі.

Наш лозунг: ні адной жонкі камандзіра і палітработніка, якая-б не прымала ўдзел у палітычнай вучобе, якая-б не чытала штодзень газет!

У радзе часцей жанчыны высунулі і ўжо вырашаюць задачу:

жонцы камандзіра і палітработніка—сярэднюю асвету. Мы заклікаем усіх жонак камандзіраў і палітработнікаў падхапіць гэту бліскучую ініціятыву нашых перадавых таварышоў.

Мы завем усіх жонак камандналга і начальніцкага складу Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі яшчэ больш актыўна дапамагаць далейшаму павышэнню баявой гатоўнасці Чырвонай Арміі. Пашырайце, таварышы, свой удзел у культурна-асветнай рабоце, у стварэнні культурнага, утульнага жылля для байца і камандзіра, у арганізацыі іх культурнага адпачынку!

Прайшоўшыя па ўсіх часцях выстаўкі жаночай і дзіцячай творчасці, алімпіяды мастацкай самадзейнасці, нарэшце, выстаўка, арганізаваная ў часе нашай нарады ў Крэмлі, наглядна паказалі, колькі таленавітых, здольных людзей ў нашым асяроддзі. Паставім усе гэтыя таленты і здольнасці на службу нашай роднай Чырвонай Арміі.

Множце рады варашылаўскіх стралкоў і кавалерыстаў, рады актывістак проціпаветранай і проціхімічнай абароны. Няхай расце лік адважных парашутыстак, плаўцоў, спартсменак. Жонкам камандзіраў Чырвонай Арміі павінны належаць лепшыя паказальнікі і рэкорды ў жаночым фізкультурным руху.

Памятайце, таварышы, аб узрастаючай ваеннай небяспецы, аб пагрозе нападу імперыялістаў на нашу радзіму.

Мацуйце абарону нашай вялікай краіны!

Мы ведаем сілу і магутнасць нашай Чырвонай Арміі—надзейнейшага аплоту мірнай працы соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян. Мы ведаем, што Чырвоная Армія, узрошчаная Леніным і Сталіным, кіруемая жалезным наркомам таварышам Варашылавым, гатова ва ўсякі момант біць ворага на яго ўласнай тэрыторыі, калі ён адважыцца напасці на нашу радзіму.

Жонка камандзіра і палітработніка Чырвонай Арміі не ўроніць ні адной слязінкі, праважаючы мужа ў бой за радзіму, за яе веліч, гонар і славу. Совецкая маці з гордасцю пашле любімага сына на абарону совецкай зямлі.

Мы зварачаемся да ўсіх работніц і калгасніц, жанчын—служачых і вучашчыхся, дзеячак навукі і мастацтваў: мацуйце кожная на сваім участку абарону нашай вялікай радзімы, памнажайце яе магутнасць і багацці, прымайце ўдзел у абарончай рабоце—будзьце перадавікамі спорту і фізкультуры, вучыцеся страляць, вучыцеся несці санітарную службу ў баі, вучыцеся проціпаветранай і проціхімічнай абароне, рыхтуйцеся разам з мужамі і братамі пераможна абараняць нашу родную зямлю, абараняць да апошняй каплі крыві нашы правы і заваяванні, запісаныя ў Сталінскай Канстытуцыі.

Мы зварачаемся да работнікаў і жонак гаспадарнікаў і інжынерна-тэхнічных работнікаў цяжкай прамысловасці і абарончай прамысловасці: ад вашай работы, дарагія таварышы, залежыць справа ўмацавання абароназдольнасці краіны.

Шагайце ў першых радах слаўнага стаханаўскага руху, пакажыце прыклад высокай прадукцыйнасці працы, барацьбы за высокую якасць прадукцыі. Памагайце забяспечыць нашу слаўную армію першакласнай баявой тэхнікай для знішчальнага разгрому ўсіх, хто адважыцца пасягнуць на свяшчэнныя і недатыкальныя рубяжы совецкай зямлі.

Мы зварачаемся да работніц і жонак работнікаў нашай вялікай чыгуначнай арміі: мы з
най радасцю і неаслаб
сочым, як пераможна
уперад соцыялістычны
парт—родны брат Чырв
міі. Бліскучыя перамогі ч
нага транспарту павыша
ўмацоўваюць несакрушал
магутнасць і абароназдольн
нашай беззаветна любімай
дзімы. Мы заклікаем нашых
ных падруг—чыгуначніц з я
большай упартасцю і больш
віцкай настойлівасцю змага
за наша светлае, шчаслівае
культурнае жыццё, за вялікую
справу абароны соцыялістычна
дзяржавы рабочых і сялян.

Мы зварачаемся да ўсіх жанчын Совецкага Саюза, грамадзянак першай у свеце соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян, патрыётак совецкай баць-каўшчыны: памятайце, што мы з яўляемся мацерамі—выхавальніцамі нашай моладзі—будучыні нашай краіны; выхоўвайце ў дзецях дух совецкага патрыятызму, вучыце іх любіць нашу цудоўную краіну, наш вялікі народ.

Выхоўвайце дастойных сыноў і дачок совецкага народу, якія маглі б па-большэвіцку, па-сталінску змагацца за гонар, веліч і славу нашай радзімы.

Няхай жыве наша доблесная, наша родная Чырвоная Армія!

Няхай жыве правадыр Чырвонай Арміі—наш дарагі Клімент Ефрэмавіч Варашылаў! Няхай цвіце і мацнее наша вялікая магутная і свабодная радзіма! Няхай жыве наша слаўная, гераічная партыя Леніна—Сталіна! Няхай жыве і здраўствуе доўгія і доўгія гады—на радасць совецкім народам, на радасць працоўным усяго свету—наш родны, любімы бацька, друг і настаўнік—наш Сталін!

ЖАНЧЫНА ЧЫРВОНАЙ АРМІІ БЫЛА І ЗАСТАЕЦЦА ВЕРНЫМ І ПАСТАЯННЫМ БАЯВЫМ ДРУГАМ І САРАТНІКАМ НАШАГА БАЙЦА І КАМАНДЗІРА.

(З прамовы таварыша К. Е. Варашылава на Ўсесаюзнай нарадзе жонак камандната і начальніцкага складу РСЧА.)

БАЯВЫЯ ПАДРУГІ

дывізіённай канферэнцыі к камандната састава мяне алі дэлегаткай на Ўсесаюзнараду жонак камандната чальніцкага састава Рабоча-лянскай Чырвонай Арміі.

моманту сустрэчы нас у скве ўсе мы асабліва адчувалі амыя цёплыя клопаты аб чала-веку. Але разам з тым з прыездам у Маскву пачаліся і нашы хваляванні. Вельмі турбавалі пытанні: дзе будуць праводзіць нараду і ці наведае яе таварыш Сталін?

Калі-ж мы ўваходзілі ў Крэмль, у тую гістарычную залу, дзе так нядаўна на з'ездзе гучэлі прыгожыя магутныя словы аб сталінскай Канстытуцыі, калі мы даведаліся, што на нашай нарадзе будзе прысутнічаць Сталін і яго бліжэйшыя саратнікі,— мы страшэнна ўзрадаваліся.

У вялікай зале Крэмлёўскага палаца нас чакала яшчэ адна радасць--беларускай дэлегацыі былі прадастаўлены першыя месцы, побач з далёкаўсходняй і кіеўскай дэлегацыямі. Усе мы сядзелі ўвесь час, паглядаючы на гадзіннік, нецярпліва чакаючы з'яўлення правадыроў. Роўна ў шэсць гадзін дзверы адчыніліся і ўвайшлі—наш любімы, мудры правадыр таварыш Сталін і наш першы жалезны маршал таварыш Варашылаў.

Авацыі былі працяглыя і бурныя, здавалася—мора разбушавалася і хоча выплеснуцца з берагоў.

У прэзідыум было выбрана 26 жанчын, ад нашай дэлегацыі ўвайшло двое—т. Лешчынская і я.

Сэрца замерла. Мне не верылася, што я буду сядзець побач і размаўляць з найвялікшым геніем чалавецтва — таварышом Сталіным. Мне здавалася, што ад хвалявання я не здолею сказаць і двух слоў. Ад радасці я не магла зрушыцца з месца, нехта ўзяў мяне за руку і мы пайшлі.

На ступеньках стаяў вялікі чалавек, які даў шчасце мільёнам працоўных—таварыш Сталін. Ён так проста, па-таварыску сардэчна паціснуў нам рукі і сказаў:

— Праходзьце, праходзьце, займайце месцы за сталом.

Гэтая цеплыня адразу сагрэла і супакоіла. Мы пачалі прасіць, каб тав. Сталін сеў у цэнтры, таму што яго хочуць бачыць усе дэлегаткі, але ён, усміхнуўшыся, адказаў:

— Вы гаспадары сёння, а мы вашы госці...

І сеў на задніх месцах.

Што я адчувала—трудна перадаць.

Я гутарыла са многімі дэлегаткамі, і ўсе яны адчувалі тое-ж, што і я, тое, аб чым мы гаварылі з трыбуны, што ўсе мы востра перажывалі ў той момант. Гэта любоў, вялікія, невымерныя клопаты роднага Сталіна да нас і да ўсёй краіны.

Трудна аддзякаваць за такую любоў. Кожная з нас у той момант дала сабе клятву, што наша жыццё належыць радзіме і, калі будзе патрэбна, мы здолеем яго аддаць без ваганняў. Кожная з нас рашыла, вярнуўшыся дамоў, працаваць яшчэ больш самааддана, яшчэ лепш.

Гэтае пачуццё—як мага больш і лепш працаваць—асабліва ўзмацнілася і вырасла пасля прамовы нашага любімага наркома таварыша Варашылава. Ён назваў нас баявымі падругамі і даў высокую ацэнку нашай рабоце, сказаўшы: „Побач з нашай доблеснай Чырвонай арміяй, вярней у ей самой, ёсць яшчэ адна таксама выдатная армія, армія вялікай сілы, невычарпальнай энергіі, буйнай ініцыятывы і прыгожых спраў, армія жонак, мацярэй і сясцёр нашых камандзіраў і начальнікаў"... І далей ён сказаў тое, што адчувала кожная з дэлегатак: „Мы заяўляем нашым ворагам: змагаючыся за мір, мы ўжо даўно гатовы да барацьбы за нашу незалежнасць, для абароны нераможнага будаўніцтва соцыялізма ў нашай краіне"... Калі на паседжанні ЦВК СССР Міхаіл Іванавіч Калінін уручаў мне ордэн „Знак почета", я востра адчула, што гэта высокая ўзнагарода атрымана ўсім дружным калектывам нашага палка, што гэты ордэн абавязвае нас патроіць свае сілы ў рабоце, удзесяцярыць ініцыятыву і разам з тым прадаўжаць упартую работу над сваім уласным ростам і ідэйна-палітычным развіццём.

У нашым палку ўсе жанчыны ўдзельнічаюць у грамадскай рабоце. Актывістак у нас 37 чалавек. Лепшая з іх тав. Саракож—жонка ордэнаносца-камандзіра палка. Яна—удзельніца грамадзянскай вайны. Цяпер тав. Саракож—варашылаўскі стралок, выбівае 48 ачкоў з 50 магчымых.

За мінулы год нашым палкавым жаночым калектывам была праробленa вялікая работа. Усе жанчыны нашага палка маюць абаронныя значкі. Дзесяць з іх маюць па 4 значкі, 11—па 3 значкі і ўсе астатнія—на 2 значкі. Гэта значыць, што ў выпадку вайны ўсе нашы жанчыны здолеюць пастаяць за сваю радзіму і будуць вернымі памочнікамі сваім мужам.

Нашы дзеці таксама рыхтуюцца да абароны краіны. Многія з іх ва ўзросце ад 12 да 15 год маюць па 3 значкі. Дзевятнаццаць школьнікаў здалі на „выдатна" нормы на значок ГСО.

Мая сям'я таксама не адстае. Усе мы, уключаючы 60-гадовую маці, маем абаронныя значкі.

Наш калектыў шмат чаго зрабіў, каб стварыць утульнасць у чырнонаармейскіх інтэрнатах. У ленкутках усё абсталявана нашымі рукамі. Самі шылі занавескі на вокны, парт'еры на дзверы, самі вышывалі салфетачкі і дарожкі. Шэсць тысяч каўнерыкаў пашылі мы для чырвонаармейцаў.

Дзякуючы клопатам жанчын байцы нашага палка пайшлі на манеўры як на парад. У кожнага была выгладжана гімнасцёркі, чысты каўнерык і чыстая насавая хустка. Такі выгляд яны мелі на працягу ўсяго часу асенніх манеўраў.

Гурткі самадзейнасці працуюць у нас вельмі добра. Сіламі чырвонаармейцаў і жонак камандзіраў была пастаўлена опера „Запарожац за Дунаем". Опера атрымала высокую ацэнку.

Для сустрэчы новага года мы падрыхтавалі пастаноўку п'есы Чэхава „Мядзведзь", арганізавалі канцэрт і ёлкі для дзяцей. У вечарах самадзейнасці прымаюць удзел і дзеці.

Жонкі камандзіраў нашага і спаборнічаючых палкоў заключылі соцыялістычны дагавор на выкананне раду абавязацельстваў. Галоўныя з іх—палітычная падрыхтоўка жанчын, агульнаадукацыйная падрыхтоўка, аба-



Дэлегатка Беларускай ваеннай акругі т. Лешчынская выступае на Ўсесаюзнай нарадзе жонак камандната і начскладу РСЧА.

ронная работа, культурна-асветная работа і выхаванне дзяцей.

Жаночым калектывам нашага палка былі зроблены тры ваенізаваных пераходы. Першы на 25 кілометраў, у ім удзельнічала 27 жанчын; другі на 50 кілометраў—удзельнічала 25 жанчын, а трэці, самы трудны пераход на 45 кілометраў, з якіх 15 кілометраў былі пройдзены ў процігазах.

Гэты паход быў арганізован у гонар камандуючага вайскамі Беларускай акругі камандарма I ранга тав. Убарэвіча і армейскага камісара 2 ранга тав. Буліка, якія прыязджалі праверыць выкананне дагавораў спаборніцтва палкоў і батальёнаў.

У гэтым пераходзе ўдзельнічала 18 жанчын. Палову дарогі ўсе ішлі ў паходным знаражэнні пад праліўным дажджом. Перасякалі невывучаную мясцовасць, ішлі лясамі, незнаёмымі прасёлачнымі дарогамі. Апошні дзесятак кілометраў прышлося зрабіць у цемры. Не гледзячы на гэта, прыйшлі ў назначаны пункт раней устаноўленага часу.

Трудна было, няма чаго казаць. Але за тое, як мы былі рады, калі вынікі праверкі выканання соцдагавароў паказалі, што па ўсіх відах палітычнай і баявой падрыхтоўкі, а таксама і па жаночай рабоце наш чырвонасцяжны полк — лепшы ва ўсёй акрузе.

Быў у нас чырвонаармейскі прабег на 5 кілометраў; на апошніх двух кілометраў мы, жанчыны, уключыліся ў яго. Беглі ўсе, нават 60-гадовая маці Ліксонава.

Урач гаворыць ёй:

— Вам з хворымі нагамі нельга бегчы. Усё роўна не дабяжыце.

А яна яму адказвае:

— Не магу ўстрымацца, доктар.. Усе бягуць, як-жа гэта я застануся?!.

І прабегла-такі гэтыя два кілометры.

Сапраўды, трудна ўстрымацца, калі ўдзельнічае ўвесь калектыў. Мы ўсе так зжыліся, зрадніліся з нашым палком, што адчуваем сябе адзінай, маналітнай сям'ёй.

Сталінская Канстытуцыя ў артыкуле 122 замацавала за совецкай жанчынай нябачанае ва ўсім свеце роўнапраўе з мужчынамі. У нас жанчына роўнапраўна і ў радах Чырвонай арміі, дзе ёсць жанчыны-камандзіры, камісары, лётчыкі і інжынеры. Кожная з нас ганарыцца і шчасліва, што мы жывем і працуем у вялікую сталінскую эпоху.

Нашы сэрцы перапоўнены гарачай удзячнасцю да таварыша Сталіна за шчаслівае і радаснае жыццё. Жыць радасна, працаваць радасна—ці-ж гэта не вялікае шчасце? Гэтае шчасце працы асабліва востра мы адчулі на нарадзе.

І калі ядавітая, зласлівая гадзіна фашызма пацягнецца да нашых стальных рубяжоў, усе мы возьмемся за зброю і разам са сваімі мужамі будзем змагацца за сваю прыгожую краіну. Наша несакрушальная, магутная Чырвоная армія дасць адпор ворагу, і змяце з твару зямлі фашысцкую гадзіну.

С. Ф. Ліксонава,

жонка старшага палітрука 4-га чырвонасцяжнага стралковага палка.



ХОЧАМ БЫЦЬ ЛЁТЧЫКАМІ

Сярод мноства заяў, паступіўшых у гэтыя дні ад рабочых запалкавай фабрыкі імя Кірава (Барысаў) аб сваім жаданні быць у ліку 150.000, ёсць заявы стаханавак фабрыкі тт. Шаршневай Е. І. (злева), Мічуды В. А. і Серафімовіч Н. А. Усе яны машыністкі каробачнага цэха. Фота Б. Грыгор'ева.

МОЛАДЗЬ— НА САМАЛЁТЫ!

Сталінскай Канстытуцыяй, правамі, якія яна дае совецкім грамадзянам, ганарацца ўсе працоўныя нашай краіны. Партыі Леніна—Сталіна, вялікаму правадыру народаў таварышу Сталіну мы абавязаны за шчаслівае жыццё, якое створана для нас, моладзі.

Наша совецкая моладзь—самая шчаслівая ў свеце. Мы—фізічна здаровыя, бадзёрыя, дзяўчаты і юнакі гатовы ў любы час уліцца ў рады нашай слаўнай Чырвонай арміі, стаць на абарону нашай цудоўнай краіны. Вораг не пройдзе праз нашы граніцы! Совецкая моладзь разам з непераможнай Чырвонай арміяй, знішчыць ворага на яго-ж тэрыторыі.

З пачуццём вялікага гонару за нашу цудоўную радзіму дзесяткі маладых дзяўчат і хлопцаў, у тым ліку і я, горача адгукнуліся на заклік менжынцаў—даць краіне 150 тысяч лётчыкаў. Мы парашылі паступіць у школу пілотаў пры Бабруйскім аэраклубе. Наша шчаслівая моладзь заўсёды гатова стаць на абарону сваёй слаўнай радзімы.

Моладзь на самалёты!—такі павінен быць наш лозунг.

Н. Крэмзо.

Бабруйск,
фабрыка імя Дзержынскага.

БУДУ ПІЛОТАМ

Яшчэ ў дзяцінстве я марыла стаць лётчыкам. Сустракаючы новы 1937 год, я з вялікай радасцю адзначаю, што мае мары здзейсніліся.

Без адрыву ад вытворчасці я скончыла планерную школу на „выдатна" і прыступіла да вывучэння лётнай справы. Хутка я буду пілотам.

Лётчык павінен быць добрым спартсменам. Я ўдзельнічала ва ўсебеларускіх спаборніцтвах па лёгкай атлётыцы і атрымала два першых месцы па мятанню кап'я і бегу на 800 метраў. Здала норму на значок „Варашылаўскі стралок" першай ступені, ПВХО, ГТО і ГСО. Цяпер рыхтуюся да здачы норм на значок „Варашылаўскі стралок" другой ступені.

Сваёй цэхавай арганізацыі я дапамагаю ў разгортванні абароннай работы. Падрыхтавала 18 чалавек па здачы норм на значок ГСО. Жывем мы весела і культурна.

І калі вораг пасмее пасягнуць на нашы межы, я, лётаючы на самалёце, разам з усімі нашымі пілотамі нанясу ворагу такі руйнуючы ўдар, каб ён больш не пасмеў пасягаць на нашу мірную працу.

Учлёт Пракапенко М. Н.

Нова-Веліца,
камбінат імя Гікало.

НА ЗАКЛІК МЕНЖЫНЦАЎ

Мы, моладзь, адчуваем вялікія клопаты партыі, Сталіна аб нас. Гэта я адчуваю асабіста і на сабе.

Я выхаванка дзіцячага дому.

У 1931 г. я паступіла на Бабруйскую швейную фабрыку ім. Дзержынскага. Пры разгортванні стаханаўскага руху—я першая стала стаханаўкай. З'яўляюся групоргам КСМ.

Увесь час я марыла аўладаць ваеннай справай.

І як толькі на нашай фабрыцы арганізаваўся гурток планерыстаў, я запісалася ў гэты гурток.

У першы раз, калі я села ў кабіну, я адчувала сябе шчаслівай. Ніколі не забуду гэтых хвілін!

Зараз я маю 50 палётаў, скончыла першы курс планерыстаў „на добра" і пры выпуску мяне прэміравалі.

На гэтым я не застанаўлюся, буду вучыцца далей: хачу стаць пілотам. Я горача падтрымліваю заклік „менжынцаў" аб падрыхтоўцы 150 тысяч пілотаў. Сама буду вучыцца, каб у любую хвіліну, калі вораг паспрабуе напасці на нашу шчаслівую радзіму, па першаму закліку нашай партыі і любімага правадыра народаў таварыша Сталіна, стаць на абарону нашай соцыялістычнай радзімы.

Роза Беркоўская.

ШЧАСЛІ

Праз вялікія вокны прыгожага дзіцячага дому электрычнае святло залівала шырокую вуліцу і стаяўшыя каля дому дрэвы. З вокан былі чутны звонкія галасы вясёлай дзетвары. Усе яны па-святочнаму настроены.

Сёння сабраліся яны, каб у апошні раз праверыць сваю падрыхтаванасць да ўсебеларускай алімпіяды мастацкай самадзейнасці.

— А што, калі нядобра?—хвалюючыся заўважыла загарэлая Оля Жураўская.

Саша Краўчанка адмоўна паківала галавой:

— Не можа быць, столькі рыхтаваліся. За сябе я ўпэўнена, а ты—пастарайся.

На хвіліну яны змоўклі, нібы ўспамінаючы сваю ролю. Абедзве яны даўно мараць стаць артысткамі.

Праз хвіліну з адчыненай дзверы ў залу, нібы птушкі, выляцелі юныя балерыны.

Бадзёрым голасам Гандзя Гаўрусёнак зацягнула частушку:

Да ўлады мы прышлі
Праз буры рэволюцыі.
Хай жыве вялікі Сталін
Тварэц Канстытуцыі.

Частушку падхапілі некалькі дзіцячых галасоў:

Мы забылі песні тыя,
Песні гневу і пакут,
Дні насталі залатыя
Гору месца няма тут.

Ім дапамагаў струнны аркестр.

На змену ім выйшлі Ніна Жахавец і Нюся Галкіна. Пасля было выканана некалькі нумароў фізкультуры.

Вечар самадзейнасці не парушыў распарадку дня. Роўна ў 10 гадзін дзеці ўжо былі ў сваіх беласнежных ложках і праз поўгадзіны стала зусім ціха.

На другі дзень, ледзь пачало світаць, прывычны званок разбудзіў дружную сям'ю.

— Зарадка, зарадка!—даносіўся з спальні хлапчукоў бадзёры голас Боры Багдана.

За 5 год жыцця ў дзіцячым доме шмат чаму навучыўся Бора. Ён добры спартсмен, самастойна кіруе дзіцячай ранішняй зарадкай, добра малюе.

Соф'я Грыгор'еўна Віленс

Пасля зарадкі дзеці з зубн шчоткамі, парашком і мылам н раваліся да ўмывальніка.

Там, як і заўсёды—Шура Сам чык, Зіна Курачова і Бора Ма коў—члены санбрыгады ўжо ста ля дзвярэй, правяраючы чыст пазногцяў і вушэй.

Дзяжурныя ўжо прыбіралі па Светлыя, вялікія пакоі зноў наг ніліся свежым паветрам і ласка зрок фарбай сцен, упрыгожа лозунгамі, плакатамі. На ложа блішчыць бялізна. Гэтая бе корная чыстата адчуваецца на выках кожнага выхаванца.

— Я папала ў дзіцячы у двухтыднёвым узросце,—к Нюся Галкіна.—У дзяцінстве я б самая недысцыплінаваная, а ц мяне прэміравалі кнігай, грам і я зусім стала непазнаваль Цяпер вучуся ў школе на „до і „выдатна".

15-гадовы Міша, вучань 7-га са, чытае шмат кніг па лёт справе.

Авалодаць лётнай справай—данне большасці дзяцей.

Нюся Брэль заканчвае вышыўку партрэта любімага правадыра таварыша Сталіна.

групай сваіх выхаванцаў.

Смачна паснедаўшы, падрыхтаваўшы ўрокі, дзеці, якія займаліся ў школе ў другой змене, накіраваліся ў сваю майстэрню. Там чакаў іх рознакаляровы шоўк, палатно для вышывання, швейныя машыны, сталярныя станкі. У гэтай майстэрні ўсе дзеці набываюць працоўныя навыкі. Шмат з іх ганарыцца сваёй работай. Напрыклад, Нюся Брэль ганарыцца сваім дыванам, на якім яна вышыла партрэт вялікага Сталіна і паслала ў Менск, у Палац піонераў.

У пакоях дзіцячага дому стала ціха. Толькі глуха ляскаюць шчоты пад гаспадарчымі рукамі Соф'і Грыгор'еўны. Дзеці любяць свайго дырэктара і адчуваюць на сябе яе штодзённыя клопаты. Дзеці маюць па 5 пар сподняй бялізны, 9 змен сукенак, ва ўсіх дзяцей цёплая бялізна, валёнкі, бацінкі з галошамі, добрыя паліто.

Соф'я Грыгор'еўна 5 год працуе ў дзіцячым доме і сваёй адданай працай зрабіла 4-ы дзіцячы дом самым лепшым у Рэчыцкім раёне.

Соф'і Грыгор'еўне доўга не давала спакою цесната пакояў, і яна парашыла пабудаваць яшчэ два вялікіх пакоі.

— Спачатку думала не спраўлюся,—кажа Соф'я Грыгор'еўна, — але з дапамогай раённых арганізацый, асабліва—нашых шэфаў—рабочых гваздзільнага завода „Інтэрнацыянал", у мяне хутка закончыцца будаўніцтва і будзе магчымасць даць яшчэ лепшыя ўмовы маім дзецям.

Уважлівыя клопаты аб дзецях даюць магчымасць вырасціць іх здаровымі. Самыя цяжка выхоўваемыя дзеці ў яе перавыхоўваліся

— Няма дрэнных дзяцей,—кажа Соф'я Грыгор'еўна,—дрэнныя мы кіраўнікі, калі мы не можам знішчыць у іх дрэнныя навыкі, набытыя ў беспрытульным жыцці. У мяне 41 дзіцё, большасць з іх выдатнікі. Я ганаруся, што мне даручылі гэту пачэ ную працу—выхаванне нашага маладога пакалення. Я ўпэўнена, што мае дзеці, як і тысячы совецкіх дзяцей, аб якіх клапоціцца наша партыя і лепшы друг дзяцей таварыш Сталін, будуць лепшымі актыўнымі будаўнікамі соцыялізма.

М. Ючкова.

Балетныя танцы—любімы занятак Олі Жураўскай і Сашы Краўчанка.

Праз дні незабыўныя

Нельга перадаць словамі ўсё тое, што перажыла я за час прабывання на Надзвычайным VIII усесаюзным з'ездзе Советаў. Шчаслівыя дні—яны застануцца ў памяці, як самыя светлыя, самыя прыгожыя дні ў маім жыцці.

Забітай і малапісьменнай жанчыне ў мінулым, мне цяпер разам з абраннікамі народу выпала шчасце быць дэлегатам Надзвычайнага З'езда.

Мне выпала на долю бачыць і слухаць тварца новай Канстытуцыі—нашага вялікага правадыра і любімага бацьку таварыша Сталіна.

Мне выпала на долю вялікае шчасце, як адной з абранніц 170-мільённага народу, выканаць яго волю: канчаткова абмеркаваць і зацвердзіць сталінскую Канстытуцыю—хартыю правоў шчаслівага чалавецтва.

Я належу да ліку тых шчаслівых людзей, якіх комуністычная партыя выхавала ў роўнапраўнага грамадзяніна нашай вялікай, многанацыянальнай радзімы. Я, удава, пасля смерці мужа засталася з двумя маленькімі дзецьмі. Пры царызме я і мае дзеці памерлі-б з голаду, а пры совецкай уладзе я не адчуваю сябе закінутай. Я стахановка, зарабляю 400 руб. у месяц. Маю вялікую і ўтульную кватэру. Дырэкцыя абсталявала маю кватэру прыгожай мэбляй.

Як дэпутат Горсовета, я прымала ўдзел у падвядзенні вынікаў абмеркавання праекта новай Канстытуцыі. На пленуме горсовета мяне абралі дэлегатам на XII З'езд Советаў Беларускай Рэспублікі.

Ужо тады пачуцці вялікай радасці ахапілі мяне. Пачуцці вялікай гордасці за нашу краіну, за нас працоўных, напоўнілі маё сэрца.

Для канчатковага абмеркавання і зацвярджэння праекта сталінскай Канстытуцыі XII З'езд Советаў ордэнаноснай Беларусі абраў 62 дэлегата на Надзвычайны VIII Усесаюзны З'езд Советаў. У тым ліку была і я.

Чым бліжэй мы пад'язджалі да Масквы, тым мацней і часцей білася маё сэрца. Хацелася хутчэй ехаць, хутчэй быць у Крэмлі, бачыць Вялікага Сталіна. Мне хацелася хутчэй, а час цягнуўся доўга, доўга.

Нарэшце наступіў доўгачаканы дзень—25 лістапада. У палове пятага мы былі ў Крэмлі, у Вялікім зале. Мне здавалася, што мы будзем першымі, але ўся зала была ўжо перапоўнена. Людзі ўсіх нацыянальнасцей, якія насяляюць СССР, запоўнілі залу. У многіх ордэны блішчэлі на грудзях. Ва ўсіх былі зззяючыя твары. Усе паглядалі на гадзіннікі—чакалі кіраўнікоў партыі і ўрада.

Як толькі стрэлка стала на 5 гадзін, у прэзідыум увайшлі т. т. Орджанікідзе, Чубар, Каганович, Молатаў, за таварышам Молатавым ішлі таварыш Сталін, т. т. Варашылаў і Ежоў.

Усе дэлегаты падняліся і кожны на сваёй роднай мове доўга вітаў правадыра і яго баявых саратнікаў. Цяжка перадаць тое, што адбывалася ў гэты момант у Крэмлёўскім зале. Людзі прынеслі сюды ад усяго 170-мільённага народу вялікую любоў да правадыра і выказвалі яе ў бурных авацыях і прывітальных воклічах.

Здавалася, што ў зале стала цесна. Здавалася, што сцены Крэмля раздаліся і ўвесь народ разам з намі вітаў любімага Сталіна.

Таварыш Сталін быў апранут, як і заўсёды, у поўваенную форму. Ваенная тужурка, ледзь бачны белы каўнерык. Чорныя валасы срэбрацца сівізной. Вусы не могуць схаваць сталінскую ўхмылку. Увесь час таварыш Сталін усміхаўся. Зала апладыравала таварышу Сталіну. Сталін апладыраваў нам.

Міхаіл Іванавіч Калінін доўга не мог супакоіць дэлегатаў. Потым нейчы голас запеў Інтэрнацыянал. Увесь зал разам з прэзідыумам і таварышам Сталіным спявалі пролетарскі гімн. Потым зноў апладысменты. Доўга не давалі гаварыць таварышу Сталіну.

Таварыш Сталін не раз раскрываў зялёную папку, і зноў у зале раздаваліся прывітанні любімаму правадыру. Потым таварыш Сталін абярнуўся да т. Калініна, нібыта просячы супакоіць залу. А зал яшчэ мацней апладыраваў. Нарэшце, таварыш Сталін вынуў гадзіннік і паказаў: моў, час ідзе, таварышы. Як ён паказаў гадзіннік дэлегаты яшчэ больш заапладыравалі.

Нарэшце, зал супакоіўся. Таварыш Сталін пачаў свой даклад. Зрабілася так ціха, што здавалася быццам ў зале нікога няма. А прысутнічала там звыш 3000 чалавек.

Таварыш Сталін гаварыў вельмі зразумелай і даходчывай мовай. Прамова таварыша Сталіна была поўная глыбокай мысліі, сілы, веры ў будучыню і волі да перамог.

Калі таварыш Сталін сказаў, што Канстытуцыя не ёсць словы, а ёсць справы, што Канстытуцыя выражае ўжо заваёванае народамі Совецкага Саюза, увесь зал з гонарам вітаў вялікага правадыра.

Усе дэлегаты з захапленнем слухалі кожнае слова даклада таварыша Сталіна. Кожнае слова яго моцна запала ў сэрца сваёй велічнай прастатой, гранітнай упэўненасцю, несакрушальным спакоем. У славах таварыша Сталіна гучэла ўпэўненасць мільёнаў у непераможнасці соцыялізма. У іх гучэла сіла разгорнутай соцыялістычнай дэмакратыі. У дакладзе таварыша Сталіна цвёрда гучэла непахісная ўлада рабочых і сялян, вытрымаўшых усе іспыты.

Калі таварыш Сталін дайшоў да крытыкі нашай Канстытуцыі міжнароднай буржуазіяй, я паглядзела на дыпламатычную ложу. Некаторыя дыпламаты, апладыравалі—гэта іспанскі пасол, турэцкі і чэхаславацкі, а астатнія сядзелі як на іголках.

Таварыш Сталін увесь час гаварыў хладнакроўна і спакойна. Але калі кончыў даклад, ён

Дэлегатка Надзвычайнага VIII Ўсесаюзнага З'езда Саветаў тав. ПАПКОВА робіць справаздачу аб з'ездзе на сходзе рабочых і работніц фабрыкі „Сцяг Індустрыялізацыі".

(Белсаюзфото)

падняў уверх абедзве рукі са сціснутымі кулакамі, і нібыта падымаючы, заклікаючы залу, усю краіну, увесь свет, сказаў:

— На новую барацьбу для заваявання новых перамог комунізма!

Таварыш Сталін гаварыў роўна дзве гадзіны, а здавалася некалькі хвілін,—так цікава яго было слухаць. Усе дэлегаты доўга былі пад уражаннем Сталінскага даклада.

Адзінаццаць дзён засядаў З'езд. Пасля даклада выступалі дэлегаты. Усе выступаючыя гаварылі аб нашым росце, аб нашых выдатных соцыялістычных перамогах, аб усім тым, што заваявана і запісана ў Канстытуцыі.

Кожны, хто выступаў, пачынаў імем вялікага Сталіна і канчаў яго імем, імем таго, каму мы абавязаны сваімі поспехамі, шчаслівым жыццём.

Усе выражалі думку, што ў дружнай сям'і народаў Совецкага Саюза квітнее і мацнее кожная нацыянальнасць, кожная народнасць.

Яркім выражэннем совецкай дэмакратыі з'явіліся выступленні рабочых-сталевараў, электрыкаў, машыністаў, калгаснага сялянства, інжынераў, педагогаў і іншых.

Першага снежня, пасля выступлення многіх дэлегатаў, скончыліся спрэчкі. З'езд абраў рэдакцыйную камісію для канчатковай выпрацоўкі тэкста Канстытуцыі.

Старшынёй камісіі мы абралі таварыша Сталіна. Пасля быў абвешчан перапынак работы З'езда да 5 снежня.

У гэтыя дні перарыву мы, дэлегаты, старанна вывучалі Канстытуцыю.

Пятага снежня з заключным словам выступіў таварыш Сталін, як старшыня Рэдакцыйнай камісіі.

Пасля заключнага слова таварыша Сталіна мы мандатамі галасавалі паасобку кожны пункт Канстытуцыі. Пятага снежня адбылася сусветна-гістарычная падзея: сталінская Канстытуцыя стала непахісным законам нашай дзяржавы!

Перамогшы соцыялізм зацвердзіў свае непарушныя прынцыпы.

Сталінская Канстытуцыя ўдыхнула ў мяне новыя сілы, яна ўдзесецярае творчую энергію. У гонар новай сталінскай Канстытуцыі я бяру на сябе абавязак навучыць усіх работнікаў сваёй ленты стаханаўскім метадам работы. Хачу каб уся наша лента стала стаханаўскай. Прыкладу ўсе сілы, і я гэтага дабʻюся. Я ўжо навучыла 5 работніц. Раней яны не выконвалі нормы, а цяпер перавыконваюць. Свой план я выконваю на 230 проц.

Няхай жыве сталінская Канстытуцыя, сталінскі закон нашага шчаслівага жыцця!

Слава Вялікаму Сталіну! Доўгія годы яму жыць на радасць нашай вялікай радзімы, на шчасце ўсяго працоўнага чалавецтва!

Дора Папкова

Фабрыка „Сцяг індустрыялізацыі", Віцебск.

ПА-СТАЛІНСКУ КЛАПАЦІЦЦА АБ ДЗЕ

З вялікай радасцю сустрэлі шырокія жаночыя масы Совецкага Саюза новы закон аб забароне абортаў, пашырэнні радзільных дамоў, дзетясляў і дапамозе шматсямейным. Працоўныя жанчыны ведаюць, што гэты закон адлюстроўвае сталінскія клопаты аб мацеры і дзіцяці.

Пабудова радзільных дамоў і дзіцячых ясляў урадам і партыяй ускладзена на органы НК Аховы Здароўя. Гарадскія і раённыя органы аховы здароўя, згодна пастановы СНК, атрымалі на 1936 г. адпаведныя кантрольныя лічбы на пабудовы.

Віцебскі гарадскі аддзел аховы здароўя атрымаў заданне ў 1936 г. пабудаваць двое дзетясляў і адну малочную кухню.

Вынікі будаўніцтва цалкам павінны былі залежаць ад таго, як гарадскі аддзел аховы здароўя і горсовет падыйшлі да выканання пастаўленых перад імі задач. Але віцебскія арганізацыі з самага пачатку работы аднесліся безадказна да выканання гэтых задач, што адзначана спецыяльнай пастановай СНК БССР і ЦК КП(б)Б.

СНК БССР вынес вымовы старшыні горсовета тав. Сухаручкіну і загадчыку гар. аддз. аховы здароўя т. Шэўчыку за зрыў медыцынскага будаўніцтва.

У затрымцы медбудаўніцтва па Віцебску вінаваты і НК Аховы Здароўя Беларусі. Вялікія затрымкі былі з праектамі. Замест 20 верасня па плану праекты былі атрыманы толькі ў пачатку кастрычніка, ды і тыя прышлося перарабляць на месцы. Запраектавана было паравое ацяпленне— не было катлоў, прышлося перарабляць на пячное.

У выніку такіх безадказных адносін медбудаўніцтва па гор. Віцебску пачалося толькі 10 кастрычніка. А калі ўжо прыступілі да будаўніцтва, дык паспяховай рабоце перашкаджалі неарганізаванасць з боку будуючых арганізацый: не было рабочай сілы, працавалі ў адну змену і г. д.

Але ўсё гэта ў мінулым. Цяпер медбудаўніцтва па гораду Віцебску скончана, Яслі № 2 і малочная кухня скончаны 7 снежня. Яслі № 1—18 снежня.

Цяпер неабходна ўноўпабудаваныя яслі і малочную кухню старанна ўпрыгожыць. Унутранае абсталяванне, прыгожае ўбранне—павінна радаваць совецкую маці і яе дзіця.

* * *

У Віцебску існавала адно радзільнае аддзяленне на 65 ложкаў пры больніцы імя Калініна. У сувязі з павелічэннем нараджаемасці паўстала пытанне аб расшырэнні колькасці ложкаў для рожаніц.

Быў унесен праект, каб радзільнае аддзяленне пры больніцы імя Калініна пераабсталяваць, капітальна адрамантаваць; пры больніцы імя Леніна—адчыніць новае радзільнае аддзяленне на 80 ложкаў і гінекалагічнае аддзяленне на 65 ложкаў.

Будаўніцтва гэта не было прадугледжана планам і каштарысам. Але гэтага патра[illegible] мо жыццё.

І цяпер больніца імя [illegible] мае радзільнае аддзя[illegible] 80 ложкаў і гінекала[illegible] 65 ложкаў; пры больніцы [illegible] лініна 16 снежня адчыне[illegible] дзільнае аддзяленне на 60 ло[illegible]

Зусім іншае становішча [illegible] будовай радзільных дамоў п[illegible] цебскаму раёну.

Па плану НК Аховы Здароў[illegible] ў калгасах трэба было пабуд[illegible] ваць 6 хат-радзільняў. У 1963 г. пабудавана толькі 3 хаты-радзільні, ды і тыя пры медпунктах сельсоветаў. Пабудаваныя хаты-радзільні не працуюць, бо ўтрымліваць іх павінны калгасы, а да гэтага часу калгасы аб гэтым не ведаюць. Вінават у гэтым гар. аддзел аховы здароўя, у прыватнасці т. Шэўчык, які раённаму будаўніцтву не ўдзяляў увагі.

Акрамя таго там існуе шкодная думка, што будаваць у калгасах хаты-радзільні няма патрэбы, бо ўсё роўна калгасніцы-рожаніцы паедуць раджаць у горад.

* * *

Не па-сталінску клапоцяцца аб мацеры і дзіцяці гандлюючыя арганізацыі гор. Віцебска.

У магазінах, і асабліва ў дзіцячых, зусім адсутнічае дзіцячая бялізна, пялёнкі, кляёнка, губкі, ванначкі. Для гадавалых дзяцей няма ў магазінах патрэбнага размеру вопраткі, шапачак, валёнак, бацінак, галош.

А галоўнае—нікога гэта не турбуе. У магазінах пакупніку роўнадушна адказваюць „няма“, а на запытанне: „калі будзе“?—адказ адзін: „не ведаю“.

Чаго варты такі факт. У Віцебску працуюць два буйныя гіганты—трыкатажныя фабрыкі, а дзіцячых рэйтузаў у продажы няма.

Гэта тлумачыцца выключна непаваротлівасцю і бестурботнасцю гандлюючых арганізацый.

Пара навучыцца па-сталінску клапаціцца аб дзецях.

Пятроўская.

Ўноўпабудаваныя яслі ў Віцебску

МАЕ ЗАЎВАГІ АБ ЖУРНАЛЕ

...ыве рэдакцыі жур-
...тніца і Калгасніца
...па нашаму сельсовету
...а канферэнцыя чыта-
...ала—стаханавак і леп-
...істак.

...актыў вельмі ўдзячны
...дзеную канферэнцыю.

...стаханаўкі рады выка-
...аю думку аб сталінскай
...тыцыі, сваю ўдзячнасць
...му Сталіну. Яны прыехалі
...ездарожжу, гатовыя падзя-
...а вопытам сваёй работы,
...заць сваю думку аб журнале
...унесці свае прапановы.

Адна за другой выступалі ў спрэчках лепшыя людзі калгасаў. Бралі на сябе абавязкі ў гонар сталінскай Канстытуцыі працаваць яшчэ лепш Ва ўсіх выступленнях была праяўлена гарачая любоў да вялікага Сталіна, да большэвіцкай партыі.

Як старшыня сельсовета, я павінна сказаць, што ў нас вельмі дрэнна абстаіць справа з вылучэннем жанчын на адказную работу. У гэтым цалкам вінават сельсовет і ў прыватнасці я, як кіраўнік яго.

Не ўдзялілі мы гэтаму пытанню дастатковай увагі. Па сельсовету няма ні адной жанчыны старшыні калгаса, няма загадчыцы фермы, брыгадзіра. А нельга сказаць, што ў нас няма каго вылучаць. Ёсць у нас жанчыны актывісткі, стаханаўкі. Вось напрыклад, тав. Гундарава, Ерусалімава, Рыбакова, Бяляева, Раброва і шэраг іншых.

Новая Канстытуцыя патрабуе ад кожнай установы, ад кожнага працаўніка перабудаваць сваю работу. Што я мяркую ў гэтай галіне зрабіць?

Па-першае, пабудую работу сельсовета так, каб не было ні адной скаргі, ні аднаго папроку. Разам з актывам даб'юся, што кожны грамадзянін будзе ведаць свае абавязкі па новай Канстытуцыі. Даб'юся, каб кожны грамадзянін змагаўся за яе ажыццяўленне. Па-другое, займуся штодзённым выхаваннем і вылучэннем жаночага актыву. За гэты ўчастак работы я больш чырванець не буду.

Наконт журнала „Работніца і Калгасніца Беларусі". Сувязь з журналам я маю ўжо больш двух год. Але ўсё-ж па сельсовету ў мяне падпісчыкаў журнала мала, а яшчэ менш селькораў.

На гэтай канферэнцыі я абяцала, што не менш 50 проц. жанчын майго сельсовета на 1937 г. будуць падпісчыкамі і актыўнымі ўдзельнікамі журнала. Разам з актывам, які прысутнічаў на канферэнцыі, мы правядзем гэту работу.

У калгасных чырвоных кутках мы арганізуем калектыўныя чыткі журнала. Прымацуем настаўнікаў да стаханавак, каб яны ліквідавалі сваю малапісьменнасць і каб не толькі маглі чытаць журнал, але і дзяліліся вопытам сваёй работы на яго старонках.

Вось, напрыклад, стаханаўкі Ерусалімава і Рыбакова (з калгаса „Барацьбіт"; мы іх тут-жа на канферэнцыі прэміравалі за стаханаўскую работу) уручную натрапалі па 125 кг валакна.

Чаму аб гэтым не напісаць у журнал, не падзяліцца іх вопытам работы?

Якім-бы я жадала бачыць журнал „Работніца і Калгасніца Беларусі" ў далейшым?—Мастацкі аформленым, больш ілюстраваным, больш прыгожым. Друкаваць журнал трэба на больш шчыльнай паперы, каб не прасачвалася фарба. Адзіны жаночы журнал у Беларусі можа друкавацца на лепшай паперы.

Для ўдзелу ў журнале павінны быць прыцягнуты высокакваліфікаваныя літаратурныя сілы. Жыццё наша дастаткова багатае, каб яго мастацкі паказаць і на старонках жаночага журнала.

Прапаную мець у журнале літаратурны аддзел, дзе рэкамендаваць—што чытаць і як чытаць. Журнал павінен унесці сістэму ў чытанне, бо патрабаванні да кнігі вялікія. Асабліва такая сістэма павінна быць унесена ў чытку класікаў нашых рускіх і замежных.

Нядрэнна, каб журнал час-адчасу даваў рэцэнзіі на асобныя кнігі, даваў характарыстыкі асобным аўтарам. Вось, напрыклад, я чытаю Салтыкова-Шчэдрына, Чэхава, і не ўсё разумею ў іх творах. Магчыма, дапамагчы трэба не толькі мне адной.

Яшчэ адно пытанне. Трэба журналу вучыць сваіх рабкораў, як пісаць. Аб чым пісаць ведаюць, а як напісаць—тут сустракаюцца цяжкасці.

Абяцаю быць актыўным памочнікам і ўдзельнікам у рабоце журнала.

Натал'я Власенка.
Елагінскі сельсовет, Віцебскага раёна.

Удзельніцы ўсесаюзнага фестываля народнага танца Аўчыннікава і Ермакова (Гомель) танцуюць „лявоніху".

ДА СТАГОДДЗЯ СА ДНЯ СМЕРЦІ ПУШ.

ЖЫЦЦЁ ПУШКІНА

(З біяграфічнага нарыса)

В. Верэсаеў

Александр Сергеевіч Пушкін нарадзіўся ў Маскве ў 1799 г. 26 мая па старому стылю, 6 чэрвеня па новаму. Бацька яго Сергей Львовіч быў памешчык з старадаўняга дваранскага роду.

Да дзяцей бацькам Пушкіна было мала справы, дзеці раслі на руках французскіх гувернантак. Вучыўся Пушкін неахайна і ляніва, асабліва не любіў матэматыкі. Але вельмі рана захапіўся чытаннем; тайком забіраўся ў бібліятэку бацькі і цэлымі гадзінамі чытаў усё, што траплялася пад руку Ужо на восьмым годзе пачаў пісаць па-французску вершы.

У 1811 годзе Пушкіна аддалі ў Царскасельскі ліцэй—новаадкрытую прывілеяваную навучальную ўстанову ў Царскім (цяпер Дзецкім) Сяле.

Пушкін усё больш пачаў звяртаць на сябе ўвагу самых выдатных пісьменнікаў таго часу. На яго з надзеяй глядзелі Карамзін, Бацюшкоў, Жукоўскі, кн. Вяземскі. Вясною 1816 г. Карамзін наведаў ліцэй з кн. Вяземскім і дзядзькам Пушкіна паэтам Васільем Львовічам. Ён выклікаў Пушкіна і сказаў:

— Шугай, як арол, але не сыняйся ў палёце.

Пушкін, як паказаўшы малую паспяховасць, быў выпушчан з ліцэя з чынам калежскага сакратара. Ён паступіў чыноўнікам у дзяржаўную калегію замежных спраў у Пецярбургу, з жалаваннем семсот рублёў у год.

Пушкін з галавою кінуўся ў кіпучае пецярбургскае жыццё.

Дзіўна было, калі ён паспяваў пісаць. А пісаў ён многа. Адзін за другім заканчваў раздзелы «Руслана і Людмілы», пісаў многа лірычных вершаў. Старэйшыя пісьменнікі з захапленнем сачылі за шпаркім ростам яго таленту. Жукоўскі пісаў кн. Вяземскаму: «Цудоўны талент! Якія вершы! Ён мучыць мяне сваім дарам, як здань!»...

А між тым над галавою Пушкіна збіралася навальніца. Папітыка Александра I рабілася ўсё рэакцыйней. На чале ўнутранага кіраўніцтва стаяў Аракчэеў, які марыў ператварыць Расію ў казарму. Краіна збяднела ад бесперапынных войн. Усё гэта выклікала рэзка варожыя адносіны да ўрада. Сярод ліберальнага дваранства ўзнікалі тайныя таварыствы, якія мелі на мэце абмежаванне самадзяржаўя. Пушкін стаў чупым рэхам, адлюстроўваўшым апазіцыйны настрой грамадства. Ён асыпаў эпіграмамі Александра і яго памочнікаў.

Калі да ўрада, нарэшце, дайшлі яго вольныя вершы, пецярбургскі ваенны генерал-губернатар граф Міларадовіч вытрабаваў Пушкіна да сябе. Ён прыйшоў, Міларадовіч у яго прысутнасці загадаў паліцмейстэру паехаць і зрабіць на кватэры Пушкіна вобыск.

Імператар Александр рашыў выслаць Пушкіна ў Сібір або пасадзіць яго ў Салавецкі манастыр. Шматлікія прыяцелі Пушкіна заварушыліся. Клопатамі

А. С. Пушкін.

Карамзіна і Жукоўскага было выраша на адправіць Пушкіна замест Сібіры ці Сапаўкоў на поўдзень у Екацерынаслаў (цяпер Днепрапетроўск), на службу пры галоўным папячыцелі капаністаў паўднёвага края Расіі генерале Інзове.

6 мая 1820 г. Пушкін выехаў з Пецярбурга.

Сувязь з усімі выдатнымі тагочаснымі дзеячамі рэволюцыі аказала вялікі ўплыў на палітычнае развіццё Пушкіна. Апазіцыйныя яго настроі ўзмацняліся. Гэтаму спрыялі і падзеі, якія адбываліся ў Еўропе. Папала рэволюцыя ў Іспаніі, у Неаполі, Грэцыя паўстала супроць Турцыі. Пушкін з захапленнем сачыў за ходам грэцкага паўстання, сам марыў прыняць у ім удзел.

За час прабывання ў Кішынёве Пушкіным напісан рэволюцыйны верш «Кинжал». Тады-ж напісана едкая эпіграма на Александра I «Воспитанный под барабаном». Пушкін накідвае план драмы, дзе пан прайграе ў карты свайго вернага старога слугу; пачынае паэму пра Вадзіма, легендарнага барацьбіта за свабоду вялікага Ноўгарада. У асабістых выказваннях сваіх палітычных настрояў Пушкін, як і ў Пецярбургу, не трымаўся ніякай асцярожнасці. Сакрэтныя агенты даносілі ў Пецербург: «Пушкін лае публічна і нават у кафейных дамах не толькі ваеннае начальства, але нават і ўрад».

Блізка прымыкаючы па поглядах і настроях да тайнага таварыства, Пушкін, аднак, не быў яго членам. Ніхто са змоўшчыкаў, якія ўвайшлі ў гісторыю рэволюцыйнага руху, як дзекабрысты, не выдаваў Пушкіну тайны: з аднаго боку, баяліся, што ён можа праговарыцца ў запале спрэчак, з другога—бераглі яго, як вялізарны талент, і лічылі, што пяром сваім ён дастаткова працуе для іх мэтаў.

Пушкін пісаў на поўдні вельмі многа. Ён у гэты час, як сам прызнаецца, «с ума сходил от Байрона». Напісаў паэмы «Кавказский пленник», «Бахчисарайский фонтан», «Братья-разбойники».

...у прашэнне аб адстаўцы ...ць літаратурнай працай. ...акойна чакаў адстаўкі. А ...го галавой згушчаліся ўсё ...Варанцоў атрымаў з Пецяр...у: прадпісвалася выклю...іна з службы за дрэнныя ...і неадкладна выслаць у ма...ькоў, у Пскоўскую губерню, ...д мясцовага начальства. Пуш...ломлен, калі яму аб'явілі ...энне. І ўсіх рашэнне гэта ...абурыла сваёй строгасцю. ...1824 г. одэскі граданачальнік ...Пушкіна ў Пскоўскую губерню. ...адзінокага, беднага ўражаннямі ...ў вёсцы аказаліся вельмі ...ючымі для творчасці Пушкіна. ...ісаў многа. Патрабаванні да сябе ... «Я адчуваю,—пісаў Пушкін,—што ...духоўныя сілы дасягнулі поўнай ...еласці, я магу тварыць».

У кастрычніку 1824 года Пушкін скончыў у Міхайлаўскім паэмы «Цыганы», пачатую на поўдні. У Міхайлаўскім-жа Пушкін напісаў вялікую рэч, над якою працаваў доўга і любоўна,—гістарычную трагедыю «Борис Годунов».

У Міхайлаўскім Пушкін прадаўжаў пісаць «Онегина», пачатага ў Одэсе. Закончыў трэцюю главу, напісаў чацвертую і пятую. У сярэдзіне снежня 1825 года ў дзве раніцы напісаў паэму «Граф Нулін».

19 лістапада (ст. ст.) 1825 года нечакана памёр Александр І. Імператарам павінен быў стаць наступны па парадку брат—Нікалай.

Змена царавання зарадзіла ў душы Пушкіна вялікія надзеі. Ён рашыў узбудзіць хадайніцтва аб сваім вызваленні. Нельга было выбраць больш неспрыяльны момант для хадайніцтва. Праўда, сам Пушкін не быў членам тайнага таварыства. Але амаль ва ўсіх арыштаваных знаходзілі яго рэволюцыйныя вершы. На аснове ўсіх даных для ўрада зусім ясна вырысоўвалася велізарная агітацыйная роля Пушкіна ў падрыхтоўцы паўстання.

Адказу на прашэнне Пушкіна не было. Скончылі следства. Пяцярых дзекабрыстаў павесілі, больш сотні саслалі ў Сібір на катаргу. Пушкін быў знаёмы з большасцю з павешаных, ведаў многіх з высланых. Расправа з імі зрабіла на яго ўражанне жахлівае.

3 верасня 1826 года Пушкін праводзіў вечар ў Трыгорскім. Стаяла найпрыгажэйшае надвор'е. А на досвітку ў Трыгорскае прыбегла старая няня Пушкіна Арына Радзіонаўна, растрапаная, перапалоханая і ў слязах. Яна паведаміла, што ў гэту ноч прыскакаў у Міхайлаўскае нейкі ні то афіцэр, ні то салдат, забраў Пушкіна і кудысьці павёз з сабою.

Пушкін тым часам імчаўся ў цялежцы з фельд'егерам у Маскву. Ехалі дзень і ноч. 8 верасня прыехалі. Пушкіну не далі не адпачнуць, ні пераапрануцца і пагаліцца; прамерзлага, запырсканага гразёю, яго даставілі ў палац і ўвялі ў габінет Нікалая.

Імператар сустрэў Пушкіна вельмі ветліва. Між імі адбылася доўгая размова. Цар спытаўся:—Пушкін, ці прыняў-бы ты ўдзел 14 кастрычніка, калі-б быў у Пецярбургу?

Пушкін смела адказаў:—Абавязкова, гасудар. Усе мае сябры былі ў змове, і я не мог-бы не прыняць удзелу ў ёй. Адна толькі адсутнасць выратавала мяне.

Нікалай спытаўся, ці змяніўся яго вобраз мыслей і ці дае ён слова думаць і дзейнічаць іначай, калі яму дадзена будзе свабода...

Потым цар спытаўся:

— Што ты цяпер пішаш?

— Амаль нічога, цэнзура вельмі строгая.

— Нашто-ж ты пішаш такое, чаго не прапускае цэнзура?

— Цэнзура не прапускае і самых нявінных рэчаў.

— Ну добра, дык я сам буду тваім цэнзарам. Прысылай мне ўсё, што напішаш.

Нікалай прадаўжаў адносіцца да яго з найглыбейшым недавер'ем. «Міласці», якімі асыпаў Пушкіна імператар, аказваліся, адбіралі ў яго нават тыя правы, якімі карыстаўся любы абываталь.

Пасрэднікам паміж Пушкіным і царом быў жандарскі генерал Бекендорф, начальнік славутага «Трэцяга аддзялення» ўласнай яго вялікасці канцэлярыі—самы блізкі да цара чалавек. У Маскве Пушкін прачытаў у коле сяброў свайго «Бориса Годунова». Ад Бекендорфа неадкладна прышло ўказанне, што без папярэдняга прагляду царом Пушкін не мае права якім-бы там ні было шляхам «распаўсюджваць» свае творы. Выходзіла, што Пушкін, нібы пастаўлены ў прывілеяванае ў параўнанні з іншымі становішча, не мог нават прачытаць свайго твору сябрам без папярэдняга дазволу!

Нявесяла і мутна было на душы ў Пушкіна. Ён нікому не скардзіўся на сваё цяжкое жыццё, але на твары яго сябры часта чыталі змрочны непакой. Прыдзе, засмучаны ходзіць па пакою, апусціўшы рукі ў кішэні шырокіх панталон, і панура паўтарае:

— Сумна, журботна.

Пушкін пісаў мала, да напісанага адносіўся вельмі строга і таму многага не друкаваў. За апошнія шэсць год жыцця Пушкіна чытач з буйных яго мастацкіх твораў мог пазнаёміцца толькі з «Пиковой дамой» и «Капитанской дочкой».

Чаму адносіны ўрада да Пушкіна былі такімі варожымі і падазронымі? Пушкін па самой сутнасці сваёй быў непрыгодны для самадзяржаўя. Што з таго, што Пушкін «прызнаваў» яго: Трэба было не прызнаваць, а з захапленнем любіць яго і ўслаўляць, без крытыкі, без стрыманасці і без аглядкі. Пушкін не ўмяшчаўся у рамках нікалаеўскага самадзяржаўя, не як вораг яго, а як велізарнейшая культурная з'ява, якая перарасла яго рамкі. Таксама і ў рамках прыдворнасвецкага жыцця Пушкін не ўмяшчаўся зноў-жа не як паэт, які адмаўляў яго, а як глыбока культурны, поўны высокай годнасці чалавек, арганічна няздольны стаць царадворцам—халопам.

У 1834 годзе ў Пецярбург прыехаў малады француз барон Жорж Дантэс.

Пушкін пазнаёміўся з Дантэсам хутка пасля прыезду яго ў Пецярбург. Французская жвавасць, весялосць і дасціпнасць Дантэса спадабаліся Пушкіну. Дантэс пачаў бываць у яго ў доме. Быў ён ветліва прыняты і ў сем'ях, блізкіх да Пушкіна,—у Карамзіных, Вяземскіх. Сустракаліся часта. Дантэс укахаўся ў жонку Пушкіна. Ёй ён таксама вельмі спадабаўся. Дантэс неадступна крочыў за Натальяй Нікалаеўнай, прыходзіў усюды, дзе была яна, на балах танцаваў толькі з ёю. Летам 1837 года, пасля аднаго ці двух грамадскіх балоў на модных Мінеральных водах (Елагіным востраве), увесь свет загаварыў аб ухажваннях Дантэса за жонкай Пушкіна. У Пушкіна была размова з Натальяй Нікалаеўнай, ён адмовіў Дантэсу ад дома. Але ўкаханыя працягвалі бачыцца ў агульных знаёмых і на вялікасвецкіх балах.

Драма наспявала шпарка.

Пушкін давяраў жонцы і не сумняваўся ў яе вернасці. Але яго прыводзіла ў шаленства тая роля «раганосца», якую яму зларадна пачалі прыпісваць у свеце. А гаварылі там не пра аднаго Дантэса; Пушкін расказваў другу свайму Нашчокіну, што Нікалай, як афіцэрчык, ухажвае за яго жонкай, знарок раніцамі па некалькі раз праязджае міма яе вокнаў, а ўвечары на балах пытаецца, чаму ў яе на вокнах заўсёды шторы апушчаны.

Раніцай 4 лістапада 1836 года Пушкін атрымаў па гарадской пошце напісаны змененым почаркам без подпісу пасквіль такога зместу:

«Вялікія кавалеры, камандоры і рыцары святлейшага Ордэна Раганосцаў у поўным зборы сваім, пад старшынствам вялікага магістра Ордэна, яго прэвасхадзіцельства Д. Л. Нарышкіна, аднагалосна выбралі Александра Пушкіна намеснікам вялікага магістра Ордэна Раганосцаў і гістарыёграфам Ордэна».

Такія-ж пісьмы былі разасланы і многім знаёмым Пушкіна. Як цяпер высветлілася, пасквіль быў напісаны П. В. Даўгарукавым, але за яго спіной стаяла цэлая зграя вялікасвецкіх ворагаў Пушкіна, у тым ліку, відаць, і Увараў, міністр народнай асветы, высмеяны Пушкіным у сатыры «На выздоровление Лукулла». Але Пушкін чамусьці западозрыў у пасылцы пасквіля галандскага пасланніка Гекерна. Гекерн быў распуснік і злы пляткар. Ён страсна любіў Дантэса і поўгода назад усынавіў яго, так што Дантэс называўся цяпер баронам Гекернам. Выклікаць на дуэль пасланніка Пушкін лічыў нязручным і паслаў выклік Дантэсу.

26 студзеня 1836 года ён адправіў старшаму Гекерну пісьмо, поўнае самых жахлівых заўваг.

Пасля гэтага пісьма дуэль зрабілася немінучай. Гэтага і дабіваўся Пушкін; іншага выхаду з запутанага становішча ён не бачыў. Па ўзгадненню Гекерна з Дантэсам выклік Пушкіну паслаў Дантэс. Атрымаўшы выклік Пушкін адразу супакоіўся.

Назаўтра Пушкін устаў рана. Быў, як і ўчора вясёлы, бесклапотны і спакойны. Напіўся чаю і сеў пісаць. Прышло пісьмо ад д'Аршыака, секунданта Дантэса. Ён прасіў Пушкіна прыслаць свайго секунданта для перагавораў. Пушкін пашоў шукаць секунданта. На Панцелеймонаўскай вуліцы ён выпадкова сустрэў свайго ліцэйскага таварыша палкоўніка інжынерных войск К. К. Данзаса і папрасіў яго быць секундантам. Ён паехаў да д'Аршыака, яны ўдваіх выпрацавалі ўмовы дуэлі. Данзас прывёз Пушкіну пісьмовыя ўмовы дуэлі. Пушкін не стаў іх чытаць, згадзіўся на ўсё і паслаў Данзаса купіць пісталеты. А сам весела сеў займацца справамі свайго журнала «Современник».

Ва ўмоўлены час ён сышоўся з Данзасам у кандзіцерскай «Вольфа» на рагу Неўскага праспекта. Яны селі ў сані і паехалі да вызначанага месца сустрэчы—да Каменданцкай дачы на Чорнай рэчцы. Прыехалі адначасова з праціўнікамі. Пашлі ў гай, выбралі палянку. Яна была пакрыта гурбамі снегу. Абодва секунданты і Дантэс пачалі прытаптаваць у снезе шырокую сцежку, па якой павінны былі сыходзіцца пра-

цiўнiкi. Пушкiн, захутаўшыся ў мядзвежую шубу, сядзеў на ўзгорку i нецярпліва чакаў. Секунданты адмералі на сцежцы крокі, у якасці бар'ераў паклалі на снег свае шубы і пачалі набіваць пісталеты. Пушкін нецярпліва запытаў:

— Ну, што-ж? Скончылі?

Усё было гатова. Праціўнікаў расставілі па месцах, далі ім пісталеты. Данзас падаў сігнал, махнуўшы капелюшом.

Пушкін шпарка падышоў да бар'ера, спыніўся і пачаў наводзіць пісталет, але ў гэты час Дантэс, не дайшоўшы аднаго кроку да бар'ера, стрэліў. Пушкін упаў на шынель, якая служыла бар'ерам. Ён ляжаў нерухома, тварам уніз. Секунданты і Дантэс кінуліся да яго. Пушкін прачкуўся, падняў галаву і сказаў:

— Пачакайце, я адчуваю ў сябе дастаткова сіл, каб зрабіць стрэл.

Дантэс вярнуўся на сваё месце, стаў бокам і прыкрыў грудзі правай рукою. Пушкін прыўзняўся на каленях і, поўлежачы, пачаў цэліцца. Цэліўся доўга. Раздаўся стрэл. Дантэс упаў. Пушкін кінуў пісталет і закрычаў:—Брава!

І зноў у непрытомнасці ўпаў на снег. Аднак, Дантэса, збіла з ног толькі моцная кантузія: куля прабіла мясістыя часткі рукі і трапіла ў гузік штаноў; гэты гузік выратаваў яго.

Апрытомнеўшы, Пушкін, запытаў д'Аршыака:

— Забіў я яго?

— Не, вы яго ранілі.

— Дзіўна,—сказаў Пушкін,—я думаў, мне будзе прыемна яго забіць, але я адчуваю цяпер, што не... Да рэчы, усё роўна. Як толькі мы паправімся, зноў пачнем.

Пушкін цярпеў моцна, але часта пытаўся пра жонку:

— Яна, бедная, бязвінна церпіць і можа яшчэ пацярпець у думцы людской.

І ёй самой ён сказаў:

— Не дакарай сябе за маю смерць. Гэта—справа, якая датычыла мяне аднаго.

Злоба і шаленства, якімі ён безупынна кіпеў апошнія месяцы, цяпер зніклі: ён стаў спакойным, лагодным і ўціхамірaным. У некаторых сяброў было ўражанне, што Пушкін шукаў смерці і быў рады ёй, як выхаду з свайго цяжкога становішча.

Пушкін быў ранены ў жывот. Куля раздрабіла яму храсток. У брушной поласці адломкі касці давілі на кішэчнік. У такіх выпадках першае патрабаванне ад лячэння—даць кішэчніку лоўны спакой, спыніць яго рух опіумам. Між тым, па зусім незразумелых прычынах, лейб-хірург Арэндт назначыў хвораму клізму. Вынікі атрымаліся жахлівыя.

Пад раніцу болі некалькі зменшыліся, і Пушкін апрытомнеў. І ўжо да самай смерці ні адным стогнам, ні адным крыкам не выявіў сваіх пакут.

Ля ганку пушкінскай кватэры была даўка. Знаёмыя і незнаёмыя таўпіліся ля ўваходу, няспынна сыпаліся пытанні: «Што Пушкін? Ці лягчэй яму? Ці ёсць надзея?»

Густыя натоўпы запруджвалі ўсю вуліцу перад кватэрай Пушкіна, да ганка немагчыма было прайсці. Але вялікасвецкіх людзей тут не было.

Пушкін слабеў штогадзінна. Смерць набліжалася, і ён ясна ўсведамляў гэта. Сябры гаварылі яму:

— Усе мы спадзяемся, не адчайвайся і ты.

Пушкін адказваў:

— Не, мне тут не жыццё. Я памру, ды відаць, ужо так і трэба.

Каля поўдня 29 студзеня Пушкін папрасіў падаць люстэрка, каб паглядзець у яго і махнуў рукою. Пульс падаў і хутка зусім знік. Рукі пачалі стыць.

Дыханне было ўсё павальней. Апошняе ўздыханне. Жыццё адляцела. Прысутныя ва ўсё жыццё не маглі забыць велічавага, шчаснага спакою, што разліўся па твару памёршага Пушкіна.

На Наберажнай Мойкі, перад домам, дзе памёр Пушкін, дзеялася нешта для таго часу зусім незвычайнае. Як хвалі прыліву раслі і раслі натоўпы народу, жадаўшыя пакланіцца праху Пушкіна. Як указваюць сведкі, ля труны Пушкіна перабывала ад трыццаці да пяцідзесяці тысяч чалавек. З усіх канцоў горада цягнуліся да Мойкі экіпажы. Вознікаў наймалі, проста кажучы: «Да Пушкіна».

Ля труны Пушкіна адсутнічала вышэйшае дваранства: да труны ціснулiся студэнты, людзі вольных прафесій, чыноўнікі ніжэйшага разраду, «нацыянальныя камерсанты», «простанароддзе», той, толькі яшчэ ўзнікшы слой радыкальнай дробнай буржуазіі, які неўзабаве атрымаў назву «разначынцы». На пахаванні Пушкіна разначынцы ўпершыню выступілі на грамадскую арэну і далі сябе адчуць, як грамадскую сілу.

Апошнія гады Пушкін жыў у кальцы жахлівага адзіноцтва—грамадскага, маральнага, культурнага, літаратурнага. «Жыві адзін!»—горка гаварыў ён пра сябе. Ён і не падазраваў, колькі тысяч у яго было гарачых, шчырых прыяцеляў за межамі таго кальца, у якім ён таміўся і гінуў. Пры жыцці Пушкіна невядомыя прыяцелі гэтыя маглі многае яму не дараваць,—смерць дала ім адчуць вялікую, незамянімую каштоўнасць і патрэбнасць Пушкіна. І яны гучна, рашуча, не словамі, а ўсімі сваімі дзеяннямі, сказалі: Пушкін наш!

З'явіўся абураючы верш тады амаль яшчэ невядомага паэта Лермантава—вогненная паэтычная пракламацыя. Верш з назвычайнай хуткасцю распаўсюдзіўся ў спісах, і ўсе паўтаралі за Лермантавым:

И вы не смоете всей вашей черной кровью
Поэта праведную кровь!

Бурны ўзрыў грамадскага гневу здзівіў і спалохаў Нікалая. Спачатку ён раўнадушна аднёсся да смерці Пушкіна і ў поўнай меры апраўдаў паводзіны Дантэса. Напор знізу прымусіў імператара зразумець, што справа ішла не аб нікчэмным «сочинителе», не чыноўным камер-юнкеру яго двара, а аб чалавеку, высока цанімым самымі шырокімі коламі краіны.

Нікалаю воляй-няволяй прышлося змяніць свае адносіны да адбыўшагася, прышлося прытварыцца, што і ім самім смерць Пушкіна расцэньваецца, як вялікая нацыянальная страта. Дантэс быў разжалаван ў салдаты, і, як замежны падданы, высланы з Расіі. Гекерн адкліканы нідэрландскім урадам з паста пасланніка.

З другога боку, Нікалай паспяшыў перагарадзіць усе шляхі к праяўленню бурна-закіпаўшага грамадскага абурэння. Газетам найстражэйшым чынам было загадана пры паведамленні пра смерць Пушкіна «захоўваць належную ўмеранасць і тон прыстойнасці». Адна газета атрымала вымову за заметку, у якой пісалася, што «сонца
ві закацілася» і што «Пу
у сярэдзіне вялікай сваёй
У суседніх з кватэрай Пуш
былі расстаўлены ваенныя
пад'езда і ў самой кватэ
шпіёны. У ноч перад вынаса
30 на 31 студзеня, калі нат
шоўся і ў кватэры сядзела т
калькі бліжэйшых прыяцеляў
з'явіліся жандары на чале з
Дубельтам, начальнікам шта
жандараў. Яны перанеслі тр
Ісакіеўскі сабор, дзе назаўтра
прызначана адпяванне, а ў Кан
ную царкву. У дзень адпяванн
ступы да царквы былі агароджаны
цыяй і прапускаліся толькі запр
ныя, па спецыяльных білетах. Адг
паставілі труну ў царкоўны падвал.

У поўнач з 2 на 3 лютага да цар
квы пад'ехала цялега і дзве брычкі. У
адной брычцы сядзеў жандарскі афіцэр, у другой—прыяцель Пушкіна А. І. Тургеневу, якому было даручана праводзіць цела ў Пскоўскую губерню да месца пахавання ў Святагорскім манастыры, недалёка ад пушкінскай вёскі Міхайлаўскае. Паставілі труну на цялегу і памчаліся ва-ўсю з горада. Пскоўскаму губернатару загадзя быў пасланы высачайшы загад пры праездзе труны «воспретить всякое особенное из'явление, всякую встречу, одним словом, всякую церемонию».

Своеасаблівая пахавальная працэсія імчалася па снежнай роўнядзі на кур'ерскіх днём і ноччу, як быццам злачынцы спяшаліся тайна ад усіх прывесці к канцу сваю чорную справу.

Так хавала афіцыяльная нікалаеўская Расія найвялікшага рускага паэта.

***

Прайшло сто год са дня смерці Пушкіна. Пала самадзяржаўе, затравіўшае і забіўшае яго, паў увесь мярзотны лад, дзе адны людзі працавалі і пакутвалі, а другія нічога не рабілі. Усеагульная любоў да Пушкіна з кожным годам расце. Вызваленыя народы Совецкай краіны бачаць у ім найвялікшага рускага паэта, творца рускай літаратурнай мовы і роданачальніка новай рускай літаратуры, узбагаціўшага чалавецтва бяссмертнымі творамі, якія да гэтага часу будзяць рэволюцыйную мысль, клічуць да барацьбы за вялікае шчасце чалавецтва. Пушкін усім стаў патрэбны і незамяніма дарагі. Патрэбны і дарагі за сваю геніяльную паэтычную магутнасць, за неўгамаваную мяцежнасць, за нястомнае шуканне, за радасць і прыгожства, якім ён узбагачае жыццё, за глыбокую чалавечнасць, культурнасць, за непараўнаную музыку яго слова, за благародную прастату і яснасць мовы.

Народная сцежка, аб якой марыў Пушкін, ператварылася ў шырокую, добра ўтаптаную дарогу. Кнігі Пушкіна выходзяць у мільёнах экземпляраў і ў міг расхватваюцца масамі чытачоў, як вядро вады сухімі пяскамі пустыні. Яго ведаюць усе. Ён перакладзены на мовы самых калісьці адсталых народнасцей Совецкага Саюза. Збылося прадсказанне Пушкіна:

Слух обо мне пройдет по всей Руси великой,
И назовет меня всяк сущий в ней язык:
И гордый внук славян и финн, и ныне дикой
Тунгуз и друг степей калмык.

...АМЯЦІ НІКАЛАЯ ОСТРОЎСКАГА

...ЛАЙ ЕКСЕЕВІЧ СТРОЎСКІ

(БІЯГРАФІЯ)

Нікалай Алексеевіч Остроўскі радзіўся ў 1904 годзе ў мястэчку Шэлетоўка, Ізяслаўскага павета Валынскай губерні, у сям'і чыгуначнага рабочага. У ранняім узросце ён страціў бацьку. З таго часу сям'я так-сяк існавала на заработак мацеры і старэйшага брата—слесара чыгуначнага дэпо.

У 1915 г., калі 11-гадовага хлопчыка Нікалая Остроўскага выгналі з царкоўна-прыходскай школы за пастаянныя нелады з папом, ён з вялікімі цяжкасцямі ўстроіўся на работу ў станцыйным буфеце. З гэтага часу пачалося яго працоўнае жыццё. Ён працуе кубаўшчыком, рабочым на складзе, падручным качагара на электрастанцыі.

У 1919 г. Нікалай Остроўскі ўступае ў комсамол і становіцца ў рады адважных байцоў за вызваленне Украіны ад нямецкіх і польскіх акупантаў. Ён прымае ўдзел у грамадзянскай вайне ў конных часцях Катоўскага і Будзённага. Пад Львовам Н. А. Остроўскі атрымлівае цяжкае раненне. Але гэта толькі на час выводзіць са строю мужнага барацьбіта. Ён дэмабілізуецца толькі пасля сканчэння грамадзянскай вайны.

У 1921 г. Н. А. Остроўскі працуе ў Кіеве, у галоўных чыгуначных майстэрнях, а ў 1922 г. на ўдарным будаўніцтве чыгуначнай веткі. Тут ён захварэў тыфам. Цяжкая хвароба дае ўскладненне. Пасля выздараўлення Н. А. Остроўскі накіроўваецца камісарам батальёна войск унутранай аховы ў пагранічным Берэздоўскім раёне.

Пачынаючы з 1924 г., калі Н. А. Остроўскі ўступіў у рады большэвіцкай партыі, ён на працягу некалькіх год знаходзіўся на кіруючай комсамольскай рабоце.

У 1927 годзе ЦК комсамола Украіны прымае ўсе меры, каб аднавіць моцна падарванае здароўе Н. А. Остроўскага і даць яму магчымасць з новымі сіламі прыняцца за работу. У поўнай меры гэта не ўдаецца. Н. А. Остроўскі працуе прапагандыстам, вядзе марксісцка-ленінскія гуркі. Увесь вольны час ён аддае ўзмоцненай рабоце над сабой.

Паходы, напружаная арганізатарская і прапагандысцкая работа, вынікі старой раны і тыфа выклікаюць цяжкае захворванне, у рэзультаце якога Н. А. Остроўскі пазбаўляецца зроку.

Н. А. Остроўскі

Але бадзёрасць духу і кіпучая энергія ні на мінуту не пакідаюць слаўнага барацьбіта за соцыялізм. У 1928 годзе пачынаецца літаратурная дзейнасць Н. А. Остроўскага.

«Фізічна страціў амаль усё, засталася толькі непатухаючая энергія маладосці і страснае жаданне быць чымнебудзь карысным сваёй партыі і свайму класу»,—піша П. А. Остроўскі ў сваёй аўтабіяграфіі. Свае сілы ён аддае стварэнню рамана «Як гартавалася сталь», які выходзіць у 1932 г. Яго першы раман высока ацэнены ўсёй працоўнай моладдзю Совецкага Саюза, партыяй і ўрадам, хутка стаў адной з любімейшых кніг у нашай краіне. Ён перакладзен на многія мовы народаў СССР, а таксама і на замежныя мовы.

1 кастрычніка 1935 г. Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Саюза ССР узнагародзіў Н. А. Остроўскага ордэнам Леніна. Высокая ўзнагарода ўрада дала пісьменніку новыя сілы для далейшай работы.

Герой грамадзянскай вайны, страціўшы здароўе ў барацьбе за совецкую ўладу, Н. А. Остроўскі, будучы хворым, ні на мінуту не спыняў змагацца за соцыялізм зброяй мастацкага слова. Да апошняга моманту ён быў заняты творчай работай над новым раманам «Рожденные бурей».

Нікалай Остроўскі аддаў усе лепшыя гады свайго жыцця беззаветнай барацьбе за соцыялізм. Дастойны сын сваёй вялікай соцыялістычнай радзімы, ён быў бязмежна адданы справе партыі Леніна—Сталіна.

Апошняе пісьмо

СОЧЫ, 22 снежня (БЕЛТА). Днямі маці пісьменніка Нікалая Остроўскага атрымала ад сына, пісьмо, адпраўленае 14 снежня.

«Мілая матуля! Сёння я закончыў усе работы над першым томам «Рожденные бурей». Данае мной Цэнтральнаму Камітэту комсамола слова—закончыць кнігу к 15 снежня—я выканаў. Увесь гэты месяц я працаваў «у тры змены». У гэты перыяд я замучыў да крайнасці ўсіх маіх сакратароў, пазбавіў іх выходных дзён, прымушаючы іх працаваць з ранку і да глыбокай ночы. Бедныя дзяўчаты! Не ведаю, як яны аба мне думаюць, але я з імі паступаў несумленна.

Зараз усё ў мінулым. Я стаміўся бязмерна. Але затое кніга закончана і праз тры тыдні выйдзе з друку ў «Роман-газеце» тыражом у 150 тысяч экз., потым у некалькіх выдавецтвах агульнай сумай каля поўмільёна экземпляраў.

Ты, напэўна, чытала аб здрадніцтве Андрэ Жыда. Як ён ашукаў нашы сэрцы тады! І хто-б мог падумаць, мама, што ён зробіць так подла і нячэсна! Няхай будзе гэтаму старому чалавеку сорамна за свой учынак! Ён ашукаў не толькі нас, але і ўвесь наш магутны народ. Цяпер яго кнігу пад назвай «Зварот з Расіі» ўсе нашы ворагі скарыстаюць супроць соцыялізма, супроць рабочага класа. Пра мяне ў гэтай кнізе Андрэ Жыд напісаў «добра». Ён гаворыць, што калі-б я жыў у Еўропе, то я ў іх лічыўся-б «святым» і г. д.

Але не буду больш аб гэтым гаварыць. Я цяжка перажыў гэта здрадніцтва, бо шчыра паверыў яго словам і слязам, і тое, што ён з такім захапленнем вітаў у нашай краіне ўсе нашы дасягненні і перамогі.

Зараз я буду адпачываць цэлы месяц. Працаваць буду нямнога, калі, вядома, уцярплю. Характар-жа у нас з табой, мама, аднолькавы. Але ўсё-ж адпачну: буду чытаць, слухаць музыку і спаць пабольш, а то—6 гадзін сну мала.

Ты слухала прамову правадыра на VIII З'ездзе Советаў? Напішы мне, ці працуе ў нас радыёпрыёмнік?

Ты мне выбач, родная, за тое, што я не пісаў табе гэтыя тыдні, але я ніколі цябе не забываю. Беражы сябе і будзь бадзёрай. Зімнія месяцы пройдуць хутка, і разам з вясной я зноў вярнуся да цябе. Моцна паціскаю твае рукі, чэсныя рабочыя рукі і пяшчотна абнімаю.

Твой Н. ОСТРОЎСКІ».

ЦАНА 20 кап.

06

Новагодні „Дзед-мароз“ ля Дома Чырвонай Арміі ў Менску.

ПАПРАЎКА

У № 24 нашага журнала, у тэксце Канстытуцыі на стар. 2, у артыкуле 12 трэба чытаць: „У СССР ажыццяўляецца прынцып соцыялізма: „ад кожнага па яго здольнасці, кожнаму—па яго працы“.

Адказны рэдактар М. І. ВОЛГІНА

Адрас рэдакцыі: Менск, Дом друку, 3-ці паверх, пакой 60. Тэл. 24-118.

Друкарня імя Сталіна. Заказ № 1368. Тыраж 6.900 Галоўлітбел № 5496

Здана ў набор 28/XII—36 г. Падпісана да друку 13/I—37 г. У нумары 2½ арк. 120.140 друк. знакаў.